ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух“)

| | |
|---|---|
| На 1 мес. | — 90 к. |
| „ 3 мес. | 2 р. 60 к. |
| „ 6 мес. | 5 р. — |
| „ 12 мес. | 9 р. 75 к. |

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пашырэньне тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьвыш нормы, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбавку.

# ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЬ!

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:

| | |
|---|---|
| Рэдактар | 10-74 |
| Сакратар | 6-19 |
| Партсэктар | 13-80 |
| Сэктар інфармацыі | 13-80 |
| Начны рэдактар | 6-42 |
| Галоўная кантора | 7-81 |
| Аддзел падпіскі | 7-81 |
| „ абвестак | 7-81 |

НЯДЗЕЛЯ 22 чэрвеня 1930 г.

№ 144 (3742)

Год выданьня—XIV

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

# Калгасы БССР рапартуюць XVI партзьезду

## аб посьпехах у правядзеньні бальшавіцкай сяўбы

Перавыкананы пасеўныя пляны.---Ідзе ўзмоцненая падрыхтоўка да ўборкі ўраджаю.---Засеяны звыш пляну гэктары імя XVI зьезду.---Калгасьнікі абяцаюць партыі ва ўдарным парадку правесьці ўборачную кампанію

## Жывы кавалак сацыялізму

Калгас «Бязбожнік», які аб'яднае бадракоў, беднякоў і сераднякоў Унаўскага нацыянальнага латыскага сельсавету, Лёзьнянскага раёну, прыслаў рапарт XVI зьезду УсеКП(б). Гэты рапарт зьяўляецца лепшым адказам на прагнозы права-апартуністычных панікёраў, якія крычаць быццам бядняк і серадняк масай уцякае з калгасаў.

Калгас «Бязбожнік», узьняўшы вытворчы энтузіязм, паказаў сапраўдныя ўзоры новай гэрачнай работы на калгасных палетках.

Кулацтва вяло шырокую агітацыю супроць калгасу. У разгар сяўбы кулацкія агенты ледзь не падпалілі калгас. У жорсткім клясавым змаганьні нарадзіўся калгас і ў жорстким змаганьні ён загартаваўся. Адліў, дзякуючы праробленай агітацыйна-растлумачальнай рабоце, зьмяніўся прыпівам. ТОЛЬКІ ЗА АПОШНІЯ ДВА ТЫДНІ ЎСТУПІЛА Ў КАЛГАС 9 ГАСПАДАРАК.

КАЛГАС СВАЯЧАСОВА СКОНЧЫЎ І ПЕРАВЫКАНАЎ ПЛЯН ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ, БОЛЬШ 25 ПРОЦ. ПЛОШЧЫ ЗАСЕЯНА ТЭХНІЧНЫМІ КУЛЬТУРАМІ. Калгасьнікі прыступаюць зараз да пабудовы новых двароў для скаціны, павялічваюць малочнае стада на 20 штук, гадуюць 58 штук маладняка.

КАЛГАС ПРЫСТУПІЎ ДА ПАБУДОВЫ ДВУХ ІНТЭРНАТАЎ І ГРАМАДЗКАЙ СТАЛОЎКІ ДЛЯ СВАІХ ЧЛЕНАЎ.

Шырока разгарнулася ў калгасе сацыялістычнае спаборніцтва.

8 КАЛГАСЬНІКАЎ І КАЛГАСЬНІЦ УСТУПІЛІ Ў ПАРТЫЮ, 10 У КАМСАМОЛ.

У калгасе дружна, калектыўна працуюць беднякі і сераднякі розных нацый: 135 беларусаў, 57 латышоў, 2 яўрэі, 2 эстонцы і 3 палякі.

Каб вызваліць жанчыну ад хатніх клопатаў, арганізаваны дзіцячыя ясьлі.

Ёсьць яшчэ ў калгасе рад недахопаў —нядбайныя адносіны да скаціны, парушэньне працдысцыпліны, слабая культурна-выхаваўчая работа. У рапарце XVI-му зьезду партыі калгасьнікі запэўняюць, што ЯНЫ ЗРОБЯЦЬ УСЁ НАЛЕЖНАЕ, КАБ ЛІКВІДАВАЦЬ ГЭТЫЯ НЕДАХОПЫ, КАБ НАЛАДЗІЦЬ ПРАВІЛЬНУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ ПРАЦЫ. УХВАЛЯЮЧЫ ТЭЗІСЫ т. ЯКАЎЛЕВА, КАЛГАСЬНІКІ ЗАЯЎЛЯЮЦЬ, ШТО ЯНЫ ЗАЎСЁДЫ БУДУЦЬ МОЦНАЙ АПОРАЙ ПАРТЫІ І САВЕЦКАЙ УЛАДЫ НА ВЁСЦЫ.

У ПАДАРУНАК XVI ЗЬЕЗДУ КАЛГАС «БЯЗБОЖНІК» ЗАСЕЯЎ ЗВЫШ ПЛЯНУ 4 ГЭКТАРЫ ІЛЬНУ.

## У падарунак XVI зьезду

Рэдакцыя «Зьвязды» атрымала рад рапартаў XVI зьезду УсеКП(б) ад калгасаў і камун БССР.

СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЯ КАМУНА «10-ты КАСТРЫЧНІК», Лёзьнянскага раёну, паведамляе, што плян сяўбы ёю выкананы на ўсе 100 проц. Да вясны камуна мела 75 гэктараў пашы і 48 гэктараў сенажаці. Сёлета яравы клін павялічыўся на 85 гэктараў, а азімы—на 32. На ўласныя сродкі камуна пабудавала млын коштам у 15.000 рублёў. У падарунак зьезду камунары засеялі 2 гэктары ільну і 3 гэктары вікі.

КАЛГАСЬНІКІ «ЧЫРВОНАГА АРАТАРА» рапартуюць, што яны поўнасьцю скончылі веснавую сяўбу і запэўняюць зьезд, што яны зробяць усё магчымае, каб пабудаваць узорную калектыўную гаспадарку.

Члены КАЛГАСУ «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК», Сіроцінскага раёну, паведамляюць, што ў падарунак зьезду яны засеялі два гэктары ільну.

Агульны сход членаў КАЛГАСУ «БАЛЬШАВІК» гэтага-ж раёну ў сваім рапарце поўнасьцю ўхваляе тэзісы тав. Якаўлева і паведамляе, што імі засеяна звыш пляну 5 гэктараў ільну імя XVI зьезду.

Члены КАЛГАСУ «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ» (Віцебшчына) ў сваім рапарце паведамляюць, што ў калгасе арганізавана ЎДАРНАЯ ГРУПА ІМЯ XVI ПАРТЗЬЕЗДУ, якая абавязваецца заараць адзін гэктар пад лён і 2 гэктары пад зялёны корм. Калгасьнікі даюць абяцаньне зьезду арганізаваць вытворчыя нарады, закантрактаваць засевы і ўзьняць працдысцыпліну.

Члены КАЛГАСУ «БАЛЬШАВІК» (Аршаншчына) дакладваюць, што калгас, арганізаваны 4-га красавіка на былой кулацкай сядзібе, вырас за апошнія два месяцы ў два разы—з 12 гаспадарак да 29, ня гледзячы на супраціўленьне кулацтва. За кароткі тэрмін у калгасе пабудавана малочная, абсталяваны цялятнік і прыступлена да пабудовы двара для скаціны, птушніка на 300 курэй, хлявоў на 120 трусоў. Адкрыты тансама дзіцячыя ясьлі. Члены калгасу пастанавілі ў якасьці падарунку XVI партзьезду засеяць звыш пляну 5 гэктараў ільном.

Гэтыя рапарты даюць вартыя адказы ўсім тым, хто сее паніку, хоча дыскрэдытаваць калгаснае будаўніцтва, хто імкнецца зьвярнуць партыю з яе правільнага шляху.

## КЕРЧАНСКІ КАМБІНАТ УВАЙШОЎ У СТРОЙ

2/VI—30 г. пачаў працаваць кокса - хэмічны камбінат ГМЗ імя Войкава.

Керчанскія кокса - хэмічныя заводы абсталяваны паводле патрабаваньняў сучаснай тэхнікі. Будаваўся завод францускай фірмаю «Досьцікок».

Завод дасьць кокс для доменных пячэй «Госмэтавода», а з адкідаў пры каксаваньні газаў хэмзавод будзе выпаўляць бэнзолу, гудрон, аміяк, нафталіну і інш. хэмічныя прадукты.

На здымку: Агульны выгляд кокса - бэнзопявага заводу пры ГМЗ імя Войкава у Керчы.

## Узмацніць работу сярод нацменшасьцяй

### (ГУТАРКА З ЗАГАДЧЫКАМ КУЛЬТПРОПАМ ЦК КП(б)Б Т. СЯНЬКЕВІЧАМ)

Ліквідацыя нацыянальных бюро пры ЦК партыі і пры партыйных камітэтах мела сваёй мэтай узмацненьне нацработы ўсімі нашымі партыйнымі, савецкімі і прафсаюзнымі арганізацыямі, бо мы лічым, што нацработа (яўрэйская, польская і г. д.) зьяўляецца арганічнай частаю ўсёй нашай партыйнай і савецкай работы. Тэму зусім правільна зрабіла партыя, ліквідаваўшы нацбюро.

Але за апошні час мы наглядаем, што нацработе аддаецца зусім мала ўвагі і мы канстатуем значнае паслабленьне работы сярод нацменшасьцяй як у галіне савецкай, так і партыйнай, прафсаюзнай і камсамольскай работы.

У зьвязку з гэтым 20-га чэрвеня г. г. культпропам ЦК КП(б)Б была склікана спэцыяльная нарада па пытаньні аб рабоце сярод нацменшасьцяй.

На нарадзе выявілася зусім ясна, што яўработа і польработа за апошні час асабліва масавая работа амаль што не вядзецца, не хапае працаўнікоў, некаторых працаўнікоў сярод нацменшасьцяй перакідаюць на іншую работу. Мы маем такое становішча, што работнікі ня хочуць ісьці на нацработу, бо няма адпаведных умоў. Мы маем з боку некаторых камсамольскіх работнікаў недаацэнку значэньня нацработы. Кампэрацыя нічога ня робіць для пашырэньня літаратуры сярод нацменшасьцяй. Слаба асьвятляецца ў друку работа сярод нацменшасьцяй. Асабліва слаба пастаўлена работа з нацменшасьцямі па прафсаюзнай лініі.

Вельмі дрэнна ў нас абстаіць справа падрыхтоўкі кадраў для нацработы, ня зьвернута належная ўвага на распаўсюджаньне газэт і кніг на нацыянальных мовах і друкаваньне падручнікаў для школ нацменшасьцяй. Масавай работы амаль зусім няма. І з-за адсутнасьці адпаведнай колькасьці працаўнікоў кампаніі, якія праводзяцца партыяй і савецкай ўладаю не абслугоўваюць у выстарчальнай меры нацменшасьцяй. Нездавальняюча праводзіцца антырэлігійная работа.

Нарада ўхваліла цэлы рад практычных прапаноў, якія маюць мэтай зрабіць зрух у рабоце сярод нацменшасьцяй і паставіць яе на належныя рэйкі.

## Напярэдадні XVI зьезду УсеКП(б)

МАСКВА, 21. (Па тэлефону ад нашага карэспандэнта). З учарайшага дня пачалі працаваць мандатная і арганізацыйная камісіі зьезду. У першы-ж дзень у мандатнай камісіі было зарэгістравана звыш 100 прыбыўшых дэлегатаў. Але гэта пакуль адзіночкі. Галоўная маса дэлегатаў чакаецца ад 22-23 чэрвеня.

* * *

Са учарайшага дня і да пачатку зьезду «Дискуссионный Листок» пры «Правде» будзе выходзіць штодзённа.

* * *

На маскоўскіх фабрыках і заводах кончаецца абмеркаваньне тэзісаў па асноўных дакладах XVI партзьезду. Ніколі яшчэ абмеркаваньне тэзісаў не выклікала такой актыўнасьці ў рабочай масе, як у сучасны момант. Характэрна, што ў адзнаку ад некаторых навуковых установаў (Прамакадэмія, І МГУ і інш.) на прадпрыемствах амаль ня было анархуістычных выказак супроць ухваленых Палітбюро ЦК тэзісаў ні справа, ні «зьлева». Рабочыя аднадушна галасуюць за генэральную лінію партыі. Рыхтуючы рапарты XVI зьезду, кожнае прадпрыемства імкнецца выявіць і лепшымі паказальнікамі — адсюль пошук ўдзім спаборніцтва, рост ліку ударнікаў і ўдарных брыгад і прыцёк заяў аб прыёме ў партыю.

* * *

Пленум Камуністычнай Акадэміі, які скончыўся гэтымі днямі, прыняў рэзалюцыю, у якой, паміж іншым, гаворыцца:

«Надыходзячы XVI партыйны зьезд прыме адпаведныя пастановы па важнейшых пытаньнях рэвалюцыйнай барацьбы і сацыялістычнага будаўніцтва, якія павінны будуць паслужыць зыходным пунктам для разгортваньня тэарэтычнай работы Камакадэміі. Пленум выказвае поўную ўпэўненасьць, што абноўленая і перабудаваўшая свае рады Камуністычная Акадэмія, на аснове гэтых пастаноў, разаўе хуткім тэмпам сваю тэарэтычную работу і стане магутным фактарам сацыялістычнага будаўніцтва на тым сусьветна - гістарычным этапе, які ў цяперашні момант праходзіць пралетарская рэвалюцыя».

* * *

Са ўсіх канцоў Савецкага Саюзу паступаюць весткі аб масавым руху сярод рабочых калгасьнікаў, індывідуальнікаў, беднякоў у сувязі з партзьездам. На ўсіх прадпрыемствах арганізуюцца ўдарныя цэхі і брыгады імя XVI партзьезду, 500 рабочых фабрыкі навуковых дапамог абвясьцілі сябе ўдарнікамі. Лепшыя ўдарнікі ўступаюць у партыю. У Сібіры разгарнуўся рух за засевы гэктараў звыш пляну імя XVI партзьезду. Бійская акруга засеяла 12.000 гэкт. звыш пляну. У гэтай-жа акрузе за май і 20 дзён чэрвеня паступіла 780 заяў ад калгасьнікаў, батракоў і беднаты аб прыёме у партыю.

## СУПРОЦЬ КАТАЎСКАГА ПРЫГАВАРУ ФАШЫСЦКАГА СУДУ

### ШМАТТЫСЯЧНЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ Ў ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 21. У Львове адбылася дэманстрацыя ў знак пратэсту супроць сьмяротнага прысуду, вынесенага львоўскім судом, трох камсамольцам за пашырэньне камуністычнай літаратуры. На дэманстрацыю напала банда пілсудчыкоў, узброеных гумовымі і жалезнымі палкамі, якая ў першую чаргу кінулася на камдэпутатаў т. т. Рожэка і Росяк. Рожэк атрымаў лёгкія параненьні. Тав. Росяк цяжка паранены.

ВАРШАВА, 21. У Варшаве адбылася вялікая дэманстрацыя пратэсту супроць расправы фашызму над маладымі рабочымі.

Дэманстранты з чырвонымі сьцягамі прайшлі па вуліцах пад лёзунгамі патрабаваньня скасаваць дзікі прыгавар.

Весткі аб падобных дэманстрацыях даходзяць і з іншых гарадоў Польшчы.

### АБУРЭНЬНЕ ПРАСКІХ РАБОЧЫХ

ПРАГА, 19. Гэтымі днямі перад будынкам польскага консульства ў Празе адбылася дэманстрацыя працоўнай моладзі ў знак пратэсту супроць сьмяротных прыгавораў тром польскім камуністам. Дэманстранты разьбілі каменьнямі некалькі шыб у памяшканьні консульства.

## МАСКОЎСКІЯ НАВІНЫ

### ПАШЫРАЕМ ГАСПАДАРЧАЕ БУДАЎНІЦТВА Ў БССР

Плян сацыялістычнага будаўніцтва бягучага году ў Беларусі пашыраецца. Саюзны ўрад вызначае далатковы водпуск аднаго мільёну рублёў на лесасеньне і лесаадчуленьне і 500 тысяч рублёў на будаўніцтва нагельнуў у БССР.

### У ТРЫ РАЗЫ БОЛЬШ ТРАКТАРАЎ

Зараз у БССР налічваецца 800 трактараў. У наступным годзе мяркуецца завезьці ў тры разы больш — 2.400 трактараў.

### 700.000 рублёў на культурнае будаўніцтва

Паводле атрыманых намі вестак, саюзны ўрад адпусьціць у гэтым годзе 400.000 руб. на будаўніцтва беларускай сельска - гаспадарчай акадэміі, 100.000 руб. на пабудову студэнцкага інтэрнату у Менску і 200.000 руб. для падрыхтоўкі ў ВНУ і тэхнікумы рабочай моладзі.

### ВЫКАНАЦЬ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ ДЭФІЦЫТНЫМІ МАТАР'ЯЛАМІ

У сувязі з недавыкананьнем пляну завозу, Дзяржплан СССР аддаў распараджэньне аб сваячасовым і поўным завозе дэфіцытных будаўнічых матар'ялаў, прызначаных для БССР.

### ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ РЫБ'ІМ ТЛУШЧАМ

«Саюзрыба» выдзеліла для БССР 39 тон рыб'яга тлушчу.

### ДАДАТКОВЫЯ АСЫГНАВАНЬНІ АСІНБУДУ

На пашырэньне работ Асінбуду ў бягучым годзе выдасцца яшчэ 415.000 рублёў.

### У ліпені прыбудуць зубаўрачэбныя інструманты

З наступаючых на склады тэхнаімпарту зубаўрачэбных прылад, значная частка іх вылучаецца для БССР. У прыватнасьці, выдзелены штучныя зубы, у якіх за апошні час адчуваўся недахоп. Усе зубаўрачэбныя інструманты будуць прывезены ў БССР у канцы ліпеня.

### Адзін дзень пяцідзённі— на прадпрыемстве

МАСКВА, 21. У мэтах умацаваньня сувязі прафапарату з рабочай і членскай масай, а таксама практычнай дапамогі нізавому прафактыву, прэзыдыум УсеЦСПС прапануе ўсім кіруючым прафорганам (УсеЦСПС, ЦК саюзаў, абласным, краёвым, рэспубліка і акруговым ЦСПСБ і прауленьням саюзаў) пераразмеркаваць работу сваіх апаратаў, такім чынам, каб кожны адказны работнік адзін дзень у пяцідзённу знаходзіўся непасрэдна на прадпрыемстве, далкам скарыстоў гэты час для работы ў нізавым прафоргане (заўком, мясцком, клюб, ІТС і г. д.). Гэта пастанова абавязкова для ўсіх саюзаў і ўваходзіць у моц неадкладна пасьля апублікаваньня. (ТАСС).

# Перашкоды ў арганізацыі сьвінаводчых саўгасаў

## павінны быць неадкладна і рашуча ліквідаваны

### Зламаць упартасьць „Белмяса“.—Даць сьвінаводчым саўгасам спэцыялістых

### Ударыць па тых, хто зрывае выкананьне катэгарычнай дырэктывы партыі і ўраду аб фарсаваньні сьвінаводзтва

Беларускія сьвінаводчыя саўгасы (якія ўваходзяць у склад «Сьвінаводу») павінны да восені паставіць 15.000 сьвіноматак, акрамя 1.000 племяных — такое цьвёрдае, катэгарычнае заданьне. Беларуская кантора «Сьвінаводу» энэргічна ўзялася за выкананьне гэтай дырэктывы партыі і ўлады. Але кіраўніком Беларускай канторы «Сьвінавод» прыходзіцца затрачваць свае сілы і энэргію па перамаганьне ўсякага роду перашкод, усякага роду затрымак. Прыходзіцца яшчэ раз канстатаваць і даводзіць да ўсеагульнага ведама, што некаторыя ўстановы і арганізацыі ня ідуць і ня хочуць ісьці насустрач «Сьвінаводу», усялякім чынам затрымліваючы правядзеньне важнейшых мерапрыемстваў, зьвязаных з вырашэньнем мясное праблемы.

У стварэньні розных затрымак першае, але далёка не начэснае месца, належыць «Белмясу». Паводле дагавору, заключанага «Саюзмясам» і «Сьвінаводам», «Белмяса» абавязана даць гэтым летам для беларускіх сьвінаводных саўгасаў 15.000 сьвіноматак (дарослых і падсьвінкаў), напярэдня вытрыманых у карантыне. Пры гэтым, дагавор прадугледжвае, што карантынны павінна арганізаваць «Белмяса» сваімі сіламі і сродкамі. Але «Белмяса» ўсялякім спосабам ухілялася ад гэтай работы. Беларуская кантора «Сьвінаводу» пасьля доўгіх і цягучых перагавораў, нарэшце, парушыла аслабаніць ад гэтай справы «Белмяса» (якое да таго-ж не падрыхтавана да гэтай работы) і дала загад сваім саўгасам — неадкладна прыступіць да абсталяваньня сеткі карантынаў.

Першыя весткі з месц гавораць, што ў саўгасе Негарэлае па карантыне пастаўлена 60 сьвіней, у саўгасе Абчак-Горкі — 162 сьвіні. Адрэшты саўгасаў вестак пакуль няма.

Але «Белмяса», лёгка аслабаніўшыся ад выкананьня аднаго пункту дагавору, зараз ужо адмаўляецца ад выкананьня асноўнага абавязку — перадаць беларускім сьвінаводным саўгасам 15.000 сьвіноматак. Неабходна зараз-жа зламаць гэтую ўпартасьць «Белмяса», якая награжае зрывам усёй сьвінаводчай справы. Мы тут прыпамянем «Белмясу» (дарэчы, і тым арганізацыям, якім «Белмяса» падпарадкавана) рашэньне XIII зьезду КП(б)Б аб тым, што беларускія сьвінаводныя саўгасы павінны да 1930-1931 г. паставіць 50.000 сьвіноматак і здаць 250.000 падсьвінкаў. Гэта дырэктыва партыйнага зьезду патрабуе поўнага выкананьня ня толькі першапачатковай, але павялічанай у 2 разы праграмы. (Да 1-га студзеня г. г. трэба будзе паставіць 30.000 сьвіноматак).

Гэтымі днямі ад «Сьвінавода» атрымана катэгарычнае патрабаваньне, каб да 16 партзьезду «Белмяса» выканала 20 проц. узятых на сябе абавязкаў — г. зн. у бліжэйшыя дні паставіла ў сьвінаводныя саўгасы ня менш 3.500 сьвіноматак. «Сьвінавод» пры гэтым адзначае, што аб тых раёнах, якія выканаюць або неправыканаюць гэтае заданьне, будзе даведзена да ведама партзьезду. Адсталым-жа раёнам будзе дана адпаведная ацэнка.

Трэба сказаць, што для кіраўнікоў «Белмяса» дырэктыў і напамінак мала. На іх, як відаць, неабходна ўзьдзейнічаць больш рашучым шляхам. Усякія далейшыя адцягваньні недапушчальны, бо калі саўгасы ня будуць укамплектаваны матачным матар'ялам у чэрвені-ліпені, дык усе вызначаныя мерапрыемствы будуць наогул правалены.



На здымку: Вопытная трактарная бульба - сажалка Менскай машына-спробнай станцыі.

Першапачатковая будаўнічая праграма па сьвінаводных саўгасах у 5 млн. руб. зараз, у сувязі з рашэньнем XIII зьезду КП(б)Б, павялічана ў два разы і даведзена да 10 млн. руб. Між тым, Беларуская кантора «Сьвінаводу» ў сваім апараце ўсё яшчэ ня мае ніводнага інжынэра, які ілянаваў-бы гэта будаўніцтва. Як відома, да ўсіх просьб канторы «Сьвінаводу» аб прызначэньні ў яе распараджэньне хаця-б аднаго інжынэра Наркамправы заставаўся глух і нем. Нарэшце, міжведамственая камісія пры Наркамправы 17 чэрвеня па сваім пасяджэньні пастанавіла абавязаць Белдзяржсьпірт у працягу 48 гадзін перадаць свайго інжынэра ў распараджэньне «Сьвінаводу». Але Белдзяржсьпірт прапусьціў гэтае аўтарытэтнае рашэньне міма сваёй увагі і да гэтага часу інжынэра трымае ў сябе. Маленькая заўвага — будаўнічая праграма Беларускай канторы «Сьвінавода» складае 200 млн. руб., а будаўнічая праграма Белдзяржсьпірту... 200 тыс. руб., г. зн. у 50 раз менш.

Будаўніцтва сьвінаводных саўгасаў зусім не забясьпечана цьвікамі. Для выкананьня скарочанай будаўнічай праграмы патрэбны 150 тон цьвікоў. У ліпе гэтага з Масквы высланы 24 тоны (яны яшчэ не маны). Дзяржплян БССР выдаў нарад на пазачарговае атрыманьне 5 тон цьвікоў, але Белпайгандаль пакуль усяе колькасьці ня выдаў. Адсутнасьць цьвікоў затрымлівае ход будаўніцтва.

Патрэбны энэргічныя і рашучыя меры.

Л. Н—даў.

## У крывавых баёх за індыйскую рэвалюцыю

### Пашыраецца рух добраахвотнікаў

### Ваенны фронт

ЛЁНДАН, 20. Ангельскія войскі ў раёне паўночна - заходняй мяжы Індыі палкам заняты барацьбой з выступленьнямі племяньняў, арганізацыяй карных экспэдыцый і дэманстратыўнымі апэрацыямі, разьлічанымі на запужваньне насельніцтва. Арыцты членаў арганізацыі «Красных рубашек» працягваюцца. Пашавар прадстаўляе сабой вялізарны ваенны лягер, які нагадвае базавы фронт.

### Дубінкі не дапамагаюць

ЛЁНДАН, 20. Добраахвотнікі ўсеіндыйскага нацыянальнага кангрэсу ў Бамбэі энэргічна пікетуюць магазыны, заклікаючы да байкоту ангельскіх тавараў. Напалы, якія праводзяцца паліцыяй на пікетыкаў, пры якіх паліцыя пускае ў ход дубінкі, да гэтага часу ня прыводзяць ні да якіх вынікаў.

### У пагоні па бомбы

ЛЁНДАН, 20. Далейшыя весткі аднесна выбухаў бомбаў у раёне гарадоў паўночнай Індыі, паказваюць, што ініцыятарам бомбавых замахаў зьяўляецца, відавочна, нейкая цэнтральная арганізацыя. У кожным выпадку спачатку разрываецца слабая бомба, якая, відавочна, прызначалася для таго, каб прыцягнуць увагу паліцыі, а другая бомба была забясьпечана гадзіньнікавым механізмам, і выбух яе быў разьлічаны на момант прыбыцьця паліцыі. У радзе выпадкаў паліцыі ўдавалася напярэдадні выбух бомбаў, але ў Ліяльпуры і Гужранвале (у Пэнджабе) рад паліцэйскіх паранены выбухам бомбаў, забясьпечаных гадзіньнікавым механізмам.

### Конная паліцыя атакуе

ЛЁНДАН, 21. З Бамбэі падаюць, што вялікія атрады конных і пешых паліцыі атакавалі ўдзельнікаў дэманстрацыі, арганізаванай добраахвотнікамі і міліцыяй нацыянальнага кангрэсу. Паранена 500 дэманстрантаў, у тым ліку шмат жанчын.

### Выбухла бомба

ЛЁНДАН, 21. Як паведамляюць з Дэлі, сёньня раніцаю ў квартале, у якім знаходзяцца вайскі, здарыўся выбух бомбы. Разбураны дом. Ахвар няма.

### Пад націскам пераважаючых сіл

ЛЁНДАН, 21. Паводле паведамленьняў, атрыманых з паўночна - заходняй пагранічнай правінцыі, атрады племя Утмэнзі пад націскам пераважаючых брытанскіх сіл адступілі на сваю тэрыторыю, выносячы з сабою параненых і пакінуўшы 10 забітых. Брытанскія войскі захапілі 23 палонных.

## Расьце савецкая тэрыторыя ў Кітаі

### Чаму перамагаюць чырвоныя?

ШАНХАЙ, 20. Падпольная камуністычная газета «Шанхай Бао» паведамляе аб рэвалюцыйным руху, які з вялікай шваркасьцю разгортваецца ў правінцыі Хубэй, Цянсі і Хунань. «5-я армія—піша газета—якая знаходзіцца ў гэтых правінцыях, лічыцца адной з лепшых сярод усіх атрадаў кітайскай чырвонай арміі. У пачатку сваёй дзейнасьці 5-я армія мела каля 10.000 вінтовак, але ў сучасны момант, дзякуючы разлажэньню ўрадавых армій і салдацкім бунтам, у армії налічваецца звыш 20.000 вінтовак. Ва ўсіх занятых чырвонай арміяй паветах стаяць атрады чырвонай гвардыі, якія налічваюць на некалькі дзесяткаў тысяч войска кожны. Наступленьне арміі на павятовыя гарады заўсёды суправаджаецца паўстаньнем унутры атакаванага гораду і гэрачным падтрыманьнем працоўных. Гэтым тлумачацца перамогі чырвонай арміі».

### У павеце Хінян створана савецкая ўлада

ШАНХАЙ, 20. Паводле вестак, павет Хінян, на поўдні правінцыі Чжэдзян, заняты чырвонаармейскім атрадам у 10.000 чалавек. У павятовым горадзе Хінян створаны савецкі ўрад, у павеце праведзена аграрная рэвалюцыя.

## Керчанскі камбінат увайшоў у строй



На здымку: Новыя печы запалены: На 2-м пляне (скрозь дым) відны машыны, якія механічна загружаюць печы мопатым вугалем.

## За кадры для падрыхтоўкі кадраў

Пытаньне аб навуковай зьмене зьяўляецца бясспрэчна самым вузкім месцам на ўсёй праблеме падрыхтоўкі кадраў. Тое разгортваньне сеткі ВНУ і навукова-дасьледчых устаноў, якое мы маем у гэтым годзе, ужо паткнулася на вялізны недахват у кваліфікаванай навуковай сіле. Для таго, каб стварыць кадры для прамысловасьці, сельскае гаспадаркі, асьветы, савецкага будаўніцтва і г. д. неабходна наяўнасьць адпаведных навукова-настаўніцкіх кадраў, патрэбны кадры для падрыхтоўкі кадраў.

Мы, у БССР, знаходзімся ў гэтых адносінах у выключна цяжкім становішчы. Толькі ў выніку Кастрычніцкай рэвалюцыі арганізавана ў Беларусі вышэйшая школа. Мы ня мелі навуковых сіл і чэрпалі іх з іншых Саюзных Рэспублік. Такі спосаб папаўненьня нашай патрэбнасьці ў навуковых кадрах з кожным месяцам становіцца ўсё менш эфэктыўным. Саюзныя рэспублікі, у тым ліку і РСФСР, самі адчуваюць такі вялізны дэфіцыт у навуковых сілах, што атрыманьне іх для БССР становіцца справай амаль немагчымай. Даволі тут зазначыць, што пры паяўнасьці ў СССР каля 26 тысяч навуковых работнікаў, мінімальная патрэбнасьць у іх на бліжэйшы год вызначаецца ў 45 тысяч, а да канца бягучай пяцігодкі—ня менш 82 тысяч чалавек, каб зразумець, як вострая абстаіць пытаньне і наколькі нерэальны падзеі на атрыманьне Беларусьсю навуковых работнікаў з па-за межаў.

Між тым, існуючае ў нас, у БССР, становішча з падрыхтоўкай навуковых кадраў ня можа не выклікаць трывогі. Асьпірантура, якая ёсьць у БССР, колькасна пязначная і ня можа здаволіць і 1/5 рэальнай патрэбнасьці. Яна невыстарчальна здавальняюча і ў сацыяльных адносінах. Кіраўніцтва ёю, як акадэмічная работа пастаўлена падзвычай кепска. Яна распылена дробнымі групамі па розных навуковых і навучальных установах. У значнай ступені ў выніку гэтага яна пазбаўлена неабходнага марксыцкага кіраўніцтва. Па гэтай-жа прычыне работа з ёю носіць непляпамерны характар. Лепшая частка асьпірантаў з самага пачатку сваёй вучобы загружаецца не навуковай работай і заданьнямі ў такой меры, што параліжуецца ўсякая магчымасьць весьці нармальную навуковую работу. У выніку замест кваліфікаваных навуковых работнікаў мы часамі атрымліваем «полузнаек», «недавучаных вучоных», якім павінны даручаць адказьнейшую работу перападрыхтоўкі кадраў. А за дэфэкты, з якімі выпускаюцца дзесяткі асьпірантаў, мы расплацімся тысячамі скалечаных сьцыялістых.

**Аўтары гэтых радкоў, блізка стаячыя да справы падрыхтоўкі асьпірантаў БССР, лічаць становішча ў гэтай галіне зусім нецярпімым і патрабуючым безадкладнага ўмяшаньня кіруючых органаў.**

Трэба неадкладна сканцэнтраваць усю справу падрыхтоўкі асьпірантуры ў адной установе, забясьпечыўшы ёй моцнае ідэалёгічнае і арганізацыйнае кіраўніцтва падрыхтоўкай навуковай сілы. Бяз гэтага ўсе гутаркі аб палепшэньні работы з асьпірантурай зьявяцца бясплённымі. Гэта мерапрыемства павінна быць ажыцьцёўлена зараз-жа з тым, каб была забясьпечана нармальная работа з асьпірантурай з самага пачатку наступаючага акадэмічнага году.

Гэта мерапрыемства зьяўляецца, відома, толькі напярэдняй умовай для належнай арганізацыі работы з асьпірантурай. Неабходна прыкладаць да асьпірантуры ўвагу партыйнай арганізацыі і савецкай грамадзкасьці. Неабходна пакончыць з маючай месца недаацэнкай значэньня пытаньня аб навуковай зьмене. Неабходна палепшыць матар'яльнае становішча асьпірантаў. Неабходна стварыць умовы, пры якіх асьпіранты маглі-б займацца сваім непасрэдным абавязкам — навуковай кваліфікацыяй. Неабходна, урэшце, кінуць на работу з асьпірантурай нашы лепшыя марксыцкія сілы. Усё гэта зрабіць зусім магчыма ў нашых умовах. Але зрабіць гэта трэба неадкладна. Час не чакае.

Е. Рыўлін і С. Вальфсон.

## 14 кастрычніка—„Дзень ураджаю і калектывізацыі“

МАСКВА. Паводле прыкладу мінулых год, 14 кастрычніка будзе «днём ураджаю і калектывізацыі». Асноўная мэта сьвята—замацаваньне калгаснага будаўніцтва, а таксама ўцягненьне ў калгасны рух шырокіх мас беднякоў і сераднякоў. У «дзень ураджаю і калектывізацыі» будуць створаны выстаўкі, якія малюць дасягненьні сельскае гаспадаркі ў асобных раёнах. (ТАСС).

УСЕ НА РАБОЧУЮ МАСОЎКУ ФРУНЗАЎСКАГА РАЁНУ

Фрунзаўскі раённы камітэт партыі і ЦСПСБ склікаюць, 22-га чэрвеня а 5 гадз. увечары у садзе „Прафінтэрн“

шырокую рабочую масоўку, прысьвечаную вынікам XIII зьезду КП(б)Б і задачам XVI зьезду УсеКП(б)

З дакладам выступіць т. СЛАВІНСКІ.

Пасьля дакладу адбудзецца вялікая мастацкая частка.
Уваход па білетах, раздаваемых фабзаўмаёнкомамі і на прафбілетах.

Фрунзаўскі РК КП(б)Б і ВСПСБ.

# XIII зьезд КП(б)Б

# Спрэчкі па справаздачы Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б

## Прамова тав. ЧАРВЯКОВА

Таварышы, мая задача, мне думаецца, заключаецца ў тым, каб даць адказ перад КП(б)Б у асобе XIII зьезду, на пытаньні, зьвязаныя з барацьбой партыі супроць правага ўхілу і прымірэнчых да яго адносін, супроць нацыянал-дэмакратызму, апартунізму, а таксама адносна тэй пазыцыі, якую займаў і займаю я ў гэтай барацьбе.

XII зьезд партыі вынес цэлы рад важнейшых пастаноў, даў дырэктыву аб тым, што КП(б)Б павінна няўхільна змагацца за генэральную лінію партыі, каб, вядучы, ня спыняючы, барацьбу супроць «левых» загібаў, супроць рэштак трацкізму, накіроўваць галоўны агонь супроць правага ўхілу, як найбольш небясьпечнага на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва.

Тав. Сталін, кажучы яшчэ на лістападаўскім пленуме ў 1928 г. аб правым ухіле, гаварыў: «Да чаго зводзіцца правы ўхіл, куды ён цягне? Ён цягне, —адказвае тав. Сталін,—па лініі прыстасаваньня да буржуазнай ідэалёгіі, па лініі прыстасаваньня нашай палітыкі да густаў і патрэб савецкай буржуазіі».

XII зьезд КП(б)Б у сваёй пастанове паказаў на тое, што трэба весьці самую рашучую растлумачальную працу для высьвятленьня сутнасьці і небясьпекі правага ўхілу таму, што ў некаторых зьвеньнях нашай арганізацыі, значныя і сутнасьць гэтай небясьпекі не заўсёды зьяўляецца досыць яснай. На XIII зьезьдзе КП(б)Б мы павінны адзначыць, што правы ўхіл за гэты час вывяў цалкам свой твар, што мы маем усе магчымасьці для таго, каб ахарактарызаваць гэты правы ўхіл, як сыстэму погляду, як палітычную лінію, якая разыходзіцца па ўсіх асноўных пытаньнях з лініяй партыі і ўсьвядоміць усю небясьпеку гэтага ўхілу для сацыялістычнага будаўніцтва. Партыя нанесла рашучы ўдар правым элемэнтам таксама, як і рознавідным правых ва ўмовах БССР—нацыянал-апартуністым і нацыянал-шавіністым розных колераў.

Было-б памылковым, калі-б хто-небудзь думаў, што правы ўхіл гэта ёсьць паасобныя памылкі, паасобныя няправільныя ўстаноўкі і г. д. Правы ўхіл ёсьць цэлая сыстэма погляду, паасобная лінія, якая адрозьніваецца ад генэральнай лініі партыі, якая вядзе барацьбу супроць генэральнай лініі нашай партыі.

Менавіта правыя ўхілістыя разыходзіліся з нашай партыяй, з генэральнай лініяй партыі, у пытаньнях аб ацэнцы перажытых намі на поўным этапе хлебных, эмісійных цяжкасьцяй і г. д. Правыя ўхілістыя маюць сваю, адрозьніваючую іх ад ленінскай лініі, установку на пытаньнях тэмпаў індустрыялізацыі, лічачы ўзятыя намі тэмпы не адпавядаючымі сучаснаму становішчу і разьвіцьцю сельскай гаспадаркі. Правыя ўхілістыя разыходзяцца з нашай партыяй у пытаньнях аб укладаньні сродкаў у цяжкую прамысловасьць, або на такім важным пытаньні, якім тэмпам і ў якіх суадносінах нам разьвіваць цяжкую і лёгкую індустрыю. У той час, калі наша партыя кажа, што ў справе індустрыялізацыі мы павінны ў першую чаргу разгортваць буйную прамысловасьць, вырабы сродкаў вытворства, правыя робяць установку, што ўвязваньне сродкаў у цяжкую прамысловасьць зьяўляецца шкодным. Правыя і іх ідэйны правадыр Бухарын дэкларавалі неабходнасьць раўнаньня на «вузкія месцы» ў разгортаньні індустрыялізацыі нашай краіны, у процілегласьць установцы партыі, якая патрабуе самай рашучай мабілізацыі нашых сіл для перамаганьня ўсякага роду цяжкасьцяй, у тым ліку і «вузкіх месц».

Нам усім вядома, тэорыя правых аб дэградацыі сельскай гаспадаркі, тэорыя, якая ў сучасны момант зьяўляецца нашчэнт разьбітай нашай партыяй, тэорыя, запазычаная ў контррэвалюцыйных буржуазных вучоных таксама, як і тэорыя «патухаючай крывёй».

Мы ўсе ведаем, таварышы, што правыя перацужаліся неражываных намі цяжкасьцяй у сувязі з загатоўкамі хлеба і ставілі пытаньне аб увозе ў СССР хлеба, бо на думцы правых, мы ўступілі ў наласу зацяжнага эканамічнага крызісу, з якога нам сваімі сіламі выйсьці будзе немагчыма.

Па важнейшым пытаньні сувязі рабочай клясы з сялянствам, правыя далі ўстаноўку, што гэта сувязь павінна быць, галоўным чынам, сувязьзю рынкавай у той час, як на XVI партыйнай канфэрэнцыі была дана ўстаноўка, што гэта сувязь павінна быць сувязьзю вытворчай. І вось, у той час, калі ўся партыя накіравала свае сілы для таго, каб, разгортваючы індустрыялізацыю краіны, умацоўваць, паглыбляць вытворчую сувязь з бядняцка-серадняцкімі масамі сялянства, весьці іх на шляху калектывізацыі і ліквідаваць агонь на кулака,—правыя абараняюць установку на неабходнасьць разгортваньня рынкавых узаемаадносін, таварнага звароту, робячы стаўку на разгортваньне гаспадарчай ініцыятывы індывідуальных гаспадарак, стрымліваючы тэмпы калектывізацыі сельскай гаспадаркі, таму, што на думцы правых, нам яшчэ доўгі час прыдзецца карыстацца тымі лішкамі хлеба, што выкідваюць на рынак заможныя, у тым ліку, кулацкія гаспадаркі.

Нам усім памятны хлусьлівыя і контр-рэвалюцыйныя абвінавачаньні з боку правых аб тым, што быццам нашы адносіны да сялян—гэта ёсьць вайскова-фэўдальная эксплёатацыя сялян. У той час, калі наша партыя высоўвае рабочую клясу ў сьвядомасьці таго, што рабочая кляса ёсьць арганізуючая сіла, якая, апіраючыся на беднату ў саюзе з серадняцтвам, павінна вырашаць усе пытаньні сацыялістычнага будаўніцтва, правыя высунулі абвінавачаньні супроць партыі ў вайскова - фэўдальнай эксплёатацыі сялянства, тэорыю «дані».

Адмаўленьне ад індывідуальнага абкладаньня, змазваньне пытаньняў класавай барацьбы таму, што на думцы правых, у меру сацыялістычнага будаўніцтва кулак будзе «ўрастаць» у сацыялізм—вось той комплекс паасобных установак, што складаюць цэлую сыстэму антыпартыйных, антыленінскіх погляду, адрозьніваючых лінію правых ад генэральнай лініі нашай партыі.

Правыя маюць сваю асобную ўстаноўку, сваю асаблівую лінію таксама ў пытаньнях міжнароднай палітыкі. Мы ўсе ведаем аб асобнай установцы правых, што абаранялася імі на VI кангрэсе Камінтэрну па пытаньнях трэцяга перыяду, або перыяду капіталістычнай рацыяналізацыі.

У той час, калі Камінтэрн, калі наша партыя трактавалі, што капіталістычная рацыяналізацыя, гэта ёсьць, далейшае паглыбленьне клясавых супярэчнасьцяй у капіталістычных краінах, што гэта капіталістычная рацыяналізацыя няўхільна выклікае абвастраньне клясавых боек, прыводзіць нас да далейшага разгортваньня рэвалюцыйнай барацьбы,—правыя даказвалі, што капіталістычная рацыяналізацыя паслабляе клясавыя супярэчнасьці, што яна дае магчымасьць капіталістым выходзіць паступова з тых эканамічных цяжкасьцяй, у якіх апынулася капіталістычная гаспадарка. Тэорыя правых, якая супадае зусім і цалкам з тэорыяй сацыял-дэмакратаў аб «арганізаваным капіталізьме», тэорыя аб адносінах да сацыял-дэмакратаў, якая заключаецца ў тым, што нельга весьці барацьбу супроць кіраўнікоў сацыял-дэмакратаў, што нельга зьмешваць сацыял-дэмакратыю з фашызмам, гэта тэорыя, таварышы, зусім адрозьніваецца ад лініі партыі, Камінтэрну, які вядзе рашучую барацьбу за заваяваньне мас, на адзіны фронт зьнізу і ў той-жа час выкрывае фашысцкі твар сацыял-дэмакратаў, якія ў сучасны момант сталі яўнай агентурай і абаронцамі капіталістычнага ладу.

Правыя ў сваёй барацьбе супроць генэральнай лініі партыі імкнуцца апаганіць наш Цэнтральны Камітэт, распускаюць хлусьню аб нашым унутрыпартыйным становішчы.

Вось характэрныя рысы правых, якія павінны быць зразумелымі для кожнага партыйца. Зусім правільна гаворыць т. Сталін, які ўказвае на тое, што ў выніку «перамогі правых» будзе ідэалёгічны разгром нашай партыі, разьвязваньне капіталістычных элемэнтаў, нарастаньне шансаў на рэстаўрацыю капіталізму, або, як гаварыў Ленін, «зварот да капіталізму». Вось чаму кожны партыец, кожны рабочы павінны вывучыць усе правыя правага ўхілу, каб даваць праваму ўхілу своячасовы бальшавіцкі адпор.

У барацьбе партыі з правымі, мною былі дапушчаны вялізарнейшыя памылкі. Цэнтральны Камітэт правільна зрабіў, калі выкрыў гэтыя памылкі і калі прымусіў мяне перад усёй партыяй прызнаць і прааналізаваць гэтыя памылкі і весьці супроць іх самую рашучую барацьбу. Першай, самай грубейшай маёй палітычнай памылкай зьяўляецца тое, што ў 1925 годзе на VII зьезьдзе саветаў я сьледам за Бухарыным агаласіў лёзунг «обогащайтесь». Я сказаў «багацеі селянін і чым больш ты будзеш багаты, тым больш будзе багатай наша рабочая-сялянская дзяржава». Гэты лёзунг заключае ў сабе заклік сяляну, у тым ліку і кулакоў, багацець, быццам багаценьне кулака зьяўляецца багаценьнем нашай рабочае-сялянскай дзяржавы, у той час, як кожны з нас разумее, што багаценьне кулака ёсьць узмацненьне капіталістычных элемэнтаў у нашай вёсцы за лік паслабленьня элемэнтаў сацыялістычных.

Я няўважліва аднёсься да гэтага месца і на працягу доўтага часу, да тэй пары, пакуль гэта пытаньне ня было пастаўлена перадо мной Цэнтральным Камітэтам, не адмовіўся ад гэтай няправільнай апартуністычнай ўстаноўкі.

Шкоднасьць гэтай антыпартыйнай установкі вывялася ў тым, што, напрыклад, калі наша партыя выкрыла «прышчэнаўчыну» і павяла рашучую барацьбу супроць кулацкай зямельнай палітыкі, якая праводзілася тагачасным Народным Камісарыятам Земляробства БССР, то тыя зямельныя работнікі, якія павінны былі прызнаць свае памылкі, даказвалі, што яны праводзілі няправільную кулацкую палітыку, выходзячы з той установкі, якая была зроблена ў прыватнасьці мною ў 1925 годзе.

Другая мая грубейшая палітычная памылка заключаецца ў тым, што на зьезьдзе т-ва «Проч няпісьменнасьць» у 1928 годзе я салідарызаваўся з Бухарыным, заявіўшы аб тым, што артыкул яго «Заметки Экономиста» ёсьць тое, чым кожны можа карыстацца для тлумачэньня ўсіх важнейшых пытаньняў сучаснага нэрыяду. Антыпартыйны сэнс гэтага артыкулу заключаецца ў тым, што ён сыстэматызуе ў сабе паказаньні на неабходнасьць стрымліваць тэмпы індустрыялізацыі і заяву аб шкоднасьці ўвязваньня сродкаў у буйная прамысловасьці, і тэорыю аб неабходнасьці арыентацыі на вузкія месцы, аб шкоднасьці прысьпяшэньня тэмпаў калектывізацыі і г. д. Такім чынам, салідарызацыя з гэтым артыкулам зьяўляецца салідарызацыяй па 100 порцантаў з установкамі правых.

Цэнтральны Камітэт правільна наступіў, калі ён з усёй вострасьцю, з бальшавіцкай жорсткасьцю паставіў гэтыя пытаньні перада мною і ўсёй нашай партыйнай арганізацыяй.

Я лічу, што мой абавязак у барацьбе з правым ухілам, у сувязі з тымі памылкамі, якія былі мною зроблены, зьяўляецца прызнаць і асудзіць гэтыя памылкі, выкрыць іх антыпартыйную сутнасьць, павесьці рашучую барацьбу разам з усёй партыяй супроць гэтых памылак, супроць правага ўхілу, а, значыцца, за генэральную лінію партыі.

Мы ведаем, што на лістападаўскім пленуме Цэнтральнага Камітэту правыя фактычна адмовіліся прызнаць свае памылкі, а замест гэтага імкнуліся змазаць свае разыходжаньні з партыяй. Потым імі была дана фармальная дэкларацыя аб тым, што яны прызнаюць і стаяць на генэральнай лініі нашай партыі. Аднак, трэба сказаць, што мала дэкларавалі прызнаньне сваіх памылак,—трэба ўпэрчыся ў сапраўдную барацьбу за генэральную лінію партыі, трэба даць партыі зброю для барацьбы супроць правага ўхілу, прааналізаваўшы свае няправільныя антыпартыйныя ўстаноўкі.

Ці маем мы з боку ідэолёгаў правага ўхілу аналіз іх няправільных установак, актыўную барацьбу супроць правага ўхілу, актыўны ўдзел у барацьбе за генэральную лінію партыі, за выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва? Ва ўсякім выпадку наша практыка па калектывізацыі не гаворыць аб тым, што былыя ідэолёгі правага ўхілу прымаюць актыўны ўдзел у вырашэньні важнейшых і складанейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва і, у прыватнасьці, калектывізацыі.

Наадварот, мы маем у апошнія дні выбрыкі з боку правых ухілістых, якія сьведчаць аб тым, што яны (ухілістыя), прызнаўшы фармальна свае памылкі, сваю салідарнасьць з лініяй партыі, па сутнасьці гэтай лініі не падзяляюць.

Аб чым гаворыць, на прыклад, заява хаця-б Угланава (аб якой нам гаварылі на гэтым зьезьдзе), што «мы аказаліся правымі». Хто гэта «мы аказаліся правымі»? «Мы» — відаць гэта тыя аднадумцы Угланава, якія знаходзіліся ў радах ідэолёгаў і арганізатараў правага ўхілу. У чым яны аказаліся правымі? Яны аказаліся правымі ў тым, што іх лінія супроць лініі партыі была правільнай? А дзе-ж тады іх заява аб тым, што яны лічаць сваю лінію няправільнай? Аб чым гаворыць, таварышы, выступленьне аднаго надзвычай паважнага члена партыі, які таксама на адпэй з маскоўскіх канфэрэнцый заявіў аб тым, што памылка ўсяе партыі заключаецца ў тым, што мы не запрасілі мужыка аб тым, ці патрэбна ці не патрэбна правесьці нам калектывізацыю? Лёзунг партыі аб добраахвотнасьці ў правядзеньні калектывізацыі — гэта і ёсьць устаноўка партыі на тое, каб калектывізацыя была сапраўдным масавым рухам на шляху сацыялістычнага будаўніцтва бядняцка - серадняцкіх мас вёскі. А мы бачым, замест гэтай яснай устаноўкі партыі, рэцыдыў хлусьлівай заявы, што быццам у нас лінія ў дачыненьні да бядняцка - серадняцкіх мас вёскі зьяўляецца няправільнай.

Вось гэтыя, таварышы, выбрыкі правых і прымірэнцаў, а таксама адсутнасьць з боку былых ідэолёгаў правага ўхілу, яскравых і выразных установак прымушаюць нас, рыхтуючыся да XVI партыйнага зьезду, паставіць рашуча па-бальшавіцку пытаньне аб тым, з чым ідуць былыя правыя ўхілістыя да гэтага XVI зьезду? Ці ідуць яны на гэты XVI зьезд разам з намі змагацца за генэральную лінію партыі, каб разам з намі змагацца за выкананьне ўсіх задач сацыялістычнага будаўніцтва, ці яны ідуць на XVI зьезд для таго, каб весьці барацьбу супроць генэральнай лініі партыі, супроць ленінскага Цэнтральнага Камітэту нашай партыі? Гэта пытаньне павінна быць намі пастаўлена і, мне думаецца, што XIII зьезд КП(б)Б цьвёрда павінен сказаць, што ён разам з усёй партыяй, не дазволіць таго, каб хто-небудзь, прыкрываючыся або адкрыта, вёў барацьбу супроць генэральнай лініі партыі. Усякі, хто гэта захоча зрабіць, атрымае ад нас рашучы, цьвёрды, бальшавіцкі адпор.

Калі мы гаворым аб беларускім нацыянал - дэмакратызьме, то, выходячы з вывучэньня яго сацыяльных карэньняў, а таксама тых заяў, што робіцца ідэолёгамі нацыянал - дэмакратызму, мы так сказаць, абагульваем установкі, нацыянал - дэмакратаў, з тэй «нашаніўскай, адраженскай» ідэолёгіяй, якую, як вы ведаеце, нацыянал - дэмакраты імкнуцца зрабіць напярэднікам камуністычнай партыі і Савецкай Беларусі. Вядомы нацыянал - фашысты Ант. Луцкевіч ролю «Нашае Нівы» ў нэрыяд часу 1906 году вызначае наступным чынам: «Наша Ніва» — піша ён — «зьяўляецца фактычным цэнтрам ня толькі Грамады (Беларускай Сацыялістычнай Грамады), якая фармальна, як быццам замірае, але ўсяго беларускага адраженскага руху, яго генэральным штабам. Тут выраналіся ўсе справы руху. Тут было кіраўніцтва нашымі шырэйшымі акцыямі». Такая роля «Нашай Нівы» і прэтэнзіі «нашаніўцаў» вымагаюць, каб кожны з нас з усёй яскравасьцю ўявіў сабе сапраўдны твар «Нашай Нівы» і «нашаніўскай ідэолёгіі». Учора ўжо тав. Гей аб гэтым гаварыў. У дадатак да гэтага я павінен, таварышы, дадаць, што самае навярхоўнае азнаямленьне з архіўным пылам «Нашай Нівы» паказвае, што гэта была арганізацыя кулацка - буржуазная, якая ішла на буксіры ў ліберальнай буржуазіі, і якая сваю аспоўную стаўку ў Беларусі рабіла на кулацкія элемэнты.

Для больш яснага паказу гэтага досыць азнаёміцца з першымі нумарамі «Нашай Нівы», пачаўшай выходзіць у 1906 г. «Наша Ніва» у 5, 6 і 7 нумарох разьбірае пытаньне зямельнай палітыкі ў Беларусі. Яна сялянства ў Беларусі надзяляе на тры часткі: тыя, што зямлі ня маюць, тыя, што зямлі маюць мала, і тыя, што зямлі маюць досыць. Зазначым, для памяці, што яна зусім ня кажа аб тых, што маюць зямлі шмат, гэта значыць аб абшарніках. Усю шкоднасьць і цяжкасьць жыцьця беларускага сялянства яна тлумачыць тым, што ў Беларусі існуе цераспасіца (шахаўніца), сэрвітуты, а таксама асноўны закон, які забараняе польскім абшарнікам купляць у Беларусі землі. І вось, выходзячы з гэтага, «Наша Ніва» прапаноўе наступныя мерапрыемствы, што трэба зрабіць, каб паленшыць становішча беларускага сялянства. Аб бедняку і серадняку яна кажа, што гэта пытаньне вырашыць «Государственная Дума», і такім чынам, сама адмахваецца ад гэтага пытаньня. Але яна мае зусім яскравую ўстаноўку для тых, хто, як яна кажа, «мае зямлі досыць» — гэта значыць для кулакоў. Для тых, хто «мае зямлі досыць», яна разгортвае наступную праграму: скасаваць законы, што не дазвалялі і не дазваляюць свабодна купляць і прадаваць зямлю: скасаваць шахаўніцу, устроіць фальварковую або хутарскую гаспадарку, скасаваць сэрвітуты, арганізаваць крэдытную дапамогу, устанавіць дэмакратычнае самакіраваньне воласьці, павету, губэрніі, увесьці краёвае самакіраваньне з краёвым соймам і г. д.

Адсюль мы бачым, што ў важнейшым зямельным пытаньні і пытаньні аб разьвіцьці сельскай гаспадаркі, «Наша Ніва» разгортвае праграму капіталістычнага разьвіцьця, якая ў той час высоўвалася і абаранялася ўсімі ліберальна - буржуазнымі групамі і якая асноўную стаўку ў вёсцы рабіла на заможную, кулацкую частку вёскі. Адсюль-жа мы бачым, што тыя дробна-буржуазныя «сацыялістычныя» элемэнты «лева - народніцкага напрамку» з Беларускай Сацыялістычнай Грамады, якія ядналіся навакол «Нашай Нівы», цалкам ішлі на буксіры ў буржуазна-ліберальных элемэнтаў.

Цікава, таварышы, што звычайна лічаць «Нашу Ніву» арганізацыяй буржуазна - дэмакратычнай. Аднак, я знайшоў вельмі цікавы дакумант, які кажа аб тым, што «Наша Ніва» ня цуралася і манархічнай формы кіраваньня, але толькі, бачыце, у цывілізаванай форме. У другім нумары «Нашай Нівы» зьмешчан артыкул аб тым, «Што робіцца ў Чарнагорыі» і там гаворыцца так: «Быў у Чарнагорыі князь. Гэты князь карыстаўся ўладай — неабмежаванай. Але ўбачыў гэты князь, што неабмежаваная ўлада да дабра не давядзе. І вось не захацеў (?) ён кіраваць адзін. Пастанавіў ён даць свайму народу можнасьць, устанавіць такі парадак, напісаць такія законы, якія ўжо даўно былі неабходны ўсяму чарнагорскаму народу. Князь склікаў скупшчыну і падзяліў з ёю ўладу. Адно толькі шкодзіла чарнагорскаму народу атрымаць уладу — гэта тое, што міністры ў Чарнагорыі назначаліся князем.

І вось князь зьмяніў і гэты парадак. Міністры зразумелі, што гэта ня добра, яны падалі ў адстаўку. Князь назначаў такіх міністраў, што выбіраліся скупшчынай». І вось «Наша Ніва» заканчвае: «Гэтым князь паказаў першай чарнагорскай скупшчыне, што ён хоча шчыра служыць свайму народу». Бачыце, і князь таксама не нярэчыць настроям «Нашай Нівы», абы ён быў добры.

І вось, калі нам у сучасны момант, уявіўшы сабе сапраўды кулацкі твар «Нашай Нівы», прыходзіцца сустракацца з дамаганьнямі нацыянал - дэмакратычных элемэнтаў зрабіць «Нашу Ніву» папярэднікам нашай барацьбы за сацыялізм, дык гэта выклікае і павінна выклікаць толькі магутную хвалю абурэньня з нашага боку і яшчэ большага ўзмацненьня нашай барацьбы супроць беларускай контр - рэвалюцыі.

Таварышы, партыя накіравала ўсю вострасьць свайго агню супроць беларускага нацыянал - дэмакратызму, як найбольш шкоднага ва ўмовах сацыялістычнага будаўніцтва БССР.

Нам змогуць задаць пытаньне, што, можа быць, у сучасны момант беларускі нацыянал - дэмакратызм — гэта ёсьць толькі разважаньні беларускіх інтэлігентаў, ніякай небясьпекі ня мае, і таму, можа, без патрэбы і занадта многа ўвагі мы аддаем беларускаму нацыянал - дэмакратызму. Гэта ўстаноўка была-б няправільнай, шкодная і контррэвалюцыйнай. Кожны з нас павінен разумець, што беларускі нацыянал-дэмакратызм гэта ёсьць рэальнае дзеяньне контр - рэвалюцыйных элемэнтаў, якія імкнуцца зьнішчыць Беларусь Савецкую і ператварыць яе ў Беларусь буржуазную.

Гісторыя разьвіцьця Савецкай Беларусі паказвае нам, што беларускі нацыянал - дэмакратызм на ўсіх этапах сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай Беларусі вёў і вядзе нясупынную барацьбу супроць камуністычнай партыі, супроць рабочае клясы, супроць сацыялістычнага будаўніцтва, супроць Савецкай Беларусі.

Мы пядаўна мелі працэс «СВУ» на Украіне. Значэньне гэтага працэсу, як паказвае газэта «Правда», заключаецца ў тым, што «ён са ўсёй яскравасьцю павінен адчыніць вочы многім яшчэ хісткім элемэнтам з інтэлігенцыі і сялянства аб сапраўдным твары кулацкай контр - рэвалюцыі».

Карыстаючыся выкрытымі на гэтым працэсе правымі украінскай контр-рэвалюцыі, можна правесьці поўную аналёгію паміж дзеяньнямі украінскіх контр - рэвалюцыянэраў і нацыянал-дэмакратаў з дзеяньнямі беларускіх контр - рэвалюцыянэраў і беларускіх нацыянал - дэмакратаў.

Вось цікавая гістарычная даведка: у 1917 годзе украінская рада вядзе шалёную барацьбу супроць Кастрычніцкай рэвалюцыі, у Беларусі ў той-жа час і ў гэтых-жа мэтах дзейнічала беларуская рада. На Украіне склікаецца вялікая украінская рада, якая імкнулася зрабіць пераварот на Украіне і захапіць уладу ў свае рукі. У Беларусі мы маем скліканьне так званага беларускага кангрэсу, які склікаўся ў гэтых-жа самых контр - рэвалюцыйных мэтах дзеля таго, каб зрабіць тут пераварот для захвату ўлады ў рукі буржуазіі.

На Украіне ў 1918 годзе пачынаецца этапэн Скарападзкага, на Беларусі ў гэты-ж самы нэрыяд пачынаецца наладжаньне сувязі беларускай контр-рэвалюцыі з гэрманскім імпэрыялізмам у выглядзе тэлеграмы кайзэру Вільгэльму, каб ён прыняў Беларусь пад сваю «высокую» руку і перагаварыў з нямецкім камандаваньнем аб дапамозе беларускім нацыянал-дэмакратам заснаваць рэспубліку пакштат Украінскай.

На Украіне украінская контр-рэвалюцыя вылілася ў дырэкторыю Пятлюры, з паграмамі мястэчак, зьдзекамі з рабочых, беднаты і г. д.

На Беларусі мы маем апалёгічную контр-рэвалюцыю ў якасьці дзейнічаньня Балаховіча, якога беларускія нацыянал-дэмакраты лічаць беларускім бацькам.

Украінская контр-рэвалюцыя знаходзіцца ў сувязі з контр-рэвалюцыяй на Доне, Сібіры і Паўночна-Заходнім краі і г. д. Калі мы працытаем справаздачы дыпляматычных місій Беларускай Народнай Рэспублікі, а таксама азнаёмімся з матар'ялямі і іншымі дакумэнтамі розных консулаў беларускай контр-рэвалюцыі, то ўбачым паказаньні, што прадстаўнікі беларускай народнай рэспублікі ўступалі ва ўзаемаадносіны з Урангелем, Дзянікіным, Чайкоўскім, Ліаноавым, камандаваньнем французкіх, ангельскіх інтэрвэнтаў і г. д. Усюды, дзе паяўляліся контр-рэвалюцыйныя цэнтры, зьяўляліся прадстаўнікі беларускай контр-рэвалюцыі, якія імкнуліся ўступіць у сувязь дзеля сумеснай барацьбы супроць дыктатуры пралетарыяту, супроць савецкай улады, супроць Камуністычнай партыі.

Калі возьмем наступны нэрыяд, нэрыяд падпольнай працы Украінскай нацыянал-дэмакратыі ў Савецкай Украіне і разам з гэтым актыўнай барацьбы украінскіх контр-рэвалюцыянэраў, якія знаходзяцца ў эміграцыі, то і за гэты час мы знойдзем поўную суадносінасьць і ў дзеяньнях беларускіх нацыянал-дэмакратаў. У Савецкай Беларусі прытоесныя нацыянал-дэмакраты імкнуцца пралезьці на важнейшыя вучасткі для таго, каб скарыстаць іх на сваю карысьць, каб працаваць на карысьць сваіх буржуазна-дэмакратычных і нацыяналістычных ідэалаў. Там за мяжою для беларускіх нацыянал-дэмакратаў, эміграцкіх груп, друі, 2 з палов. інтэрнацыяналы, Ліга Нацый, прыёмныя для суседніх дзяржаў ёсьць тыя пункты, дзе нацыянал-дэмакраты шукаюць дапамогі ў барацьбе супроць саветаў і дзе ім даюць гроші і дапамогу на ўтрыманьне беларускай контр-рэвалюцыі. Паміж гэтымі дзьвума групамі — тымі, што засталіся ў Савецкай Беларусі, і тымі, што апынуліся ў эміграцыі, увесь час існуе ідэёвая і арганізацыйная сувязь для сумеснай барацьбы супроць бальшавікоў і саветаў.

Потым пачынаецца нэрыяд «смены вех». Буржуазныя ўрады перастаюць даваць гроші беларускім эмігрантам. З Савецкай Беларусі ідуць весткі аб вялікіх посьпехах у будаўніцтве. Беларускія нацыянал-дэмакраты — эмігранты пачынаюць шукаць шляхоў, каб перайсьці сюды ў Беларусь на працу.

Аднак, як пераходзяць сюды беларускія нацыянал-дэмакраты — ці складаюць яны сваю зброю перад пралетарскай рэвалюцыяй, ці адмаўляюцца ад барацьбы супроць дыктатуры пралетарыяту, супроць Савецкай Беларусі, супроць сацыялістычнага будаўніцтва? Не, ні ў якой меры не; яны ўтвараюць сваю «тэрыю», каб апраўдаць пераход у Савецкую Беларусь і ўтвараць пляцформу для працягу сваёй контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці.

Гэтыя тэорыі сыстэматызаваны вядомым беларускім нацыянал-фашыстым Луцкевічам, які ў сваёй брашуры «за 25 год» такім чынам апраўдвае пераход на працу ў Беларусь беларускіх нацыянал-дэмакратычных контр-рэвалюцыйных элемэнтаў.

Луцкевіч піша: «Грамадаўцы адразу (гэта значыць у 1903-5 г.) сталі на цьвёрды пункт погляду, што чысты сялянскі рух без рабочых ня здолее нічога дабіцца, што толькі пры дружным націску рэвалюцыйнага гораду і рэвалюцыйнай вёскі будзе зломлена ўлада расійскага царызму і будзе звалена панаваньне абшарнікаў і фабрыкантаў».

Далей ён гаворыць: «Грамадаўская ідэалёгія ў 1906 годзе ўсё больш і больш самавызначалася ў духу сацыял-дэмакратыі» (я вам чытаў, як яна вызначалася). І далей «сярод грамадаўцаў у меры расслаеньня агульна-расійскага рэвалюцыйнага руху пачала выяўляцца дыфэрэнцыяцыя. Выдзелілася наміж іх (у 1917 г.) больш радыкальная сацыяльная група з Зьмітром Жылуновічам (Цішка Гартным), Чарвяковым і Дылам на чале, якая пасьля ўвайшла ў склад Камуністычнай партыі і ўзяла на сабе ініцыятыву будаваньня радавай Беларусі, зьдзейсьніўшы часткова ў складзе СССР наш дзяржаўны «Ідэал».

«У 1925 годзе стварылася ў Заходняй Беларусі новая беларуская арганізацыя масавага характару—«беларускай сялянска-работніцкай грамада, пераняўшая галоўныя ідэі і лёзунгі старое беларускае сацыялістычнае грамады».

Гэта тэорыя беларускіх нацыянал-дэмакратаў павінна была служыць мосьцікам, па якім нацыянал-дэмакраты змаглі-б прыйсьці сюды, апраўдаўшы сваю працу ў Савецкай Беларусі.

Сутнасьць гэтай «тэорыі» заключаецца ў тым, што Бел. Сац. Грамада і «Наша Ніва» ёсьць папярэднікі КП(б)Б і Савецкай Беларусі, што Савецкая Беларусь «часткова зьдзяйсьняе ідэал» «Нашай Нівы» і працягвае барацьбу «Нашай Нівы» і таму трэба ісьці на працу ў Савецку Беларусь, каб тут дабівацца поўнага 100-процантнага зьдзяйсьненьня гэтага адэалу.

Для кожнага з нас павінна быць зразумелым, што «тэорыі», якія ствараюцца шляхам фальшаваньня гісторыі, зьяўляюцца контр-рэвалюцыйнымі па сваёй прыродзе, контр-рэвалюцыйнымі па сваёй мэтаімкнёнасьці. Яны ставяць сваёй мэтай ідэалёгічна разьброіць Камуністычную партыю, палітычна разграміць рабочую клясу, каб падрыхтаваць глебу для кулацкай контр-рэвалюцыі.

«Зьмяніўшы вехі», нацыянал-дэмакраты прышлі да нас не дзеля таго, каб дапамагаць нам у сацыялістычным будаўніцтве, а для таго, каб тут разам з нацыяналістычнымі кадрамі, якія засталіся тут, дабівацца 100 проц. зьдзяйсьненьня свайго дзяржаўнага ідэалу, г. зн. дзеля таго, каб дамагацца ператварэньня Беларусі пралетарскай, Беларусі Савецкай — у Беларусь буржуазна-дэмакратычную.

Мы бачылі, што нацыянал-дэмакраты часу тут ня трацілі. Усе нацыянал-дэмакратычныя прарывы, ускрытыя ў працы Наркамзему, НКАсьветы і іншых нашых установах, зьяўляюцца яскравымі паказальнікамі гэтага. Нацыянал-дэмакратычныя тэндэнцыі прасякаюць ва ўсе галіны нашага жыцьця: выдавецтва, каапэрацыя, лінгвістыка і г. д., і г. д.

Усё гэта гаворыць аб тым, што нацыянал-дэмакраты вядуць актыўную барацьбу супроць пралетарскай рэвалюцыі, зброю сваю не складаюць, што нацыянал - дэмакраты — гэта ёсьць рэальная пагроза, якую кожны з нас павінен мець на ўвазе, супроць якое кожны з нас павінен быць узброен дзеля таго, каб весьці супроць гэтай пагрозы самую рашучую барацьбу.

Таварышы, у барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам мною былі зроблены таксама грубейшыя памылкі. На XII-м зьезьдзе КП(б)Б у той час, калі ўвага КП(б)Б была сканцэнтравана на тым, каб даць генэральны бой нацыянал-дэмакратычным тэндэнцыям, імкненьням, правям, калі КП(б)Б выкрывала шкоднасьць установкі Жылуновіча, калі КП(б)Б выкрывала шкоднасьць выступленьняў пісьменьнікаў, тэатральную дыскусію і г. д., — я зрабіў вялізарную палітычную памылку, якая заключалася ў тым, што я, замест таго, каб разам з КП(б)Б абрушыцца на гэтыя правы нацыянал-дэмакратызму і нацыянал - апартунізму, фактычна ўзяў пад сваю абарону Жылуновіча, а разам з ім усе тыя тэндэнцыі, настроі і ўстаноўкі, што ім абараняліся, калі я прачытаў зядомую ўсім нам рэзалюцыю «нацыянальнай парады» 1925 году. Гэта была мая вялізарная памылка, якая сустрэла рашучы бальшавіцкі адпор на XII зьезьдзе КП(б)Б.

Калі сюды дадаць тыя няправільныя мае ўстаноўкі, што былі мною зроблены ў цэлым радзе артыкулаў і выступленьняў, выкрытыя Цэнтральным Камітэтам партыі і вядомыя вам з друку, дык для кожнага з вас будзе зразумела, што я ў барацьбе партыі супроць нацыянал - дэмакратызму, нарабіўшы цэлы рад памылак, гэтым стаў сам зброяй у руках нацыянал - дэмакратаў, якія прабавалі зрабіць, імкнуцца і заараз зрабіць мяне сваім сьцягам у барацьбе супроць лініі партыі, супроць КП(б)Б, супроць сацыялістычнага будаўніцтва.

Гэта прымушае мяне з усёй вострасьцю ставіць гэтае пытаньне прызнаць і асудзіць свае памылкі, гэта прымушае мяне з усёй вострасьцю выяўляць карэньні гэтых памылак, біць гэтыя памылкі, выяўляць іх, папярэджваць другіх таварышоў ад магчымасьці такіх памылак.

Памылкі, што былі мною зроблены, сваімі карэньнямі маюць тыя ўхілы з боку дробна - буржуазных элемэнтаў і настрояў, якія акружаюць нашу партыю, якія душаць на кожнага з нас і душылі на мяне і супроць якіх у мяне не знайшлося дастатковай бальшавіцкай цьвёрдасьці, каб ім даць своячасова патрэбны рашучы бальшавіцкі адпор.

КП(б)Б зусім правільна зрабіла, што выкрыла гэтыя памылкі, што прымусіла мяне прызнаць гэтыя памылкі, прымусіла мяне прыняць актыўны ўдзел у барацьбе супроць нацыянал - дэмакратызму, супроць нацыянал - апартунізму.

КП(б)Б павінна і далей, улічваючы ўсю шкоднасьць і небясьпеку правага ўхілу і нацыянал - апартунізму, працягваць з усёй бальшавіцкай жорсткасьцю барацьбу супроць гэтага небясьпечнейшага зьявішча ўнутры нашай партыі.

Таварышы, КП(б)Б мае ў справе сацыялістычнага будаўніцтва вялізарнейшыя дасягненьні. Рабочая кляса Беларусі пад кіраўніцтвам КП(б)Б перамагла ў дні Кастрычніцкай рэвалюцыі. Рабочая кляса Беларусі пад кіраўніцтвам КП(б)Б у саюзе з бядняцкімі і серадняцкімі масамі вёскі, вы

# Падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі
## ЯШЧЭ НЯ ВЫШЛА З НЕТРАЎ ГАБІНЭТАЎ

**...а месц не даведзены.---Завоз і рамонт уборачных машын, інвэнтару ідзе нездавальняюча.--- ...КСУ не забясьпечылі дапамогу бядняцкім і маламоцным серадняцкім гаспадаркам.**

**...тоўку да уборкі ўраджаю—у цэнтр увагі партыйных і савецкіх арганізацый**

...чэ 7-га чэрвеня даў рад ...рэктыў аб свайчасовай ...ўборачнай кампаніі. З ...шло ўжо два тыдні. ...ца гэтыя дырэктывы?

**УСЕ СІ...**

...ая работа праходзіць ...ам. Грамадзкасьць не ...ізовыя сыгналы ...гэтай важнейшай ...ая зоўля рыбы ў ...гасцэнтр, каапэра- ...арвала. На 10 чэр... праяўляюць неда- ...выкананы ўсяго на 2... ...ць да выканаўня ...Чы... ...мерствах, вызначаных урадам.

У Наркамземе дагэтуль няма канкрэтнага пляну дапамогі бядняцка-серадняцкім гаспадаркам у часе ўборкі ўраджаю.

Да 15 чэрвеня ў калгасах павінны былі быць ужо арганізаваны брыгады па ўборцы і малацьбе. На сёньняшні дзень у большасьці калгасаў гэтых брыгад няма. Да іх арганізацыі, нават, і не прыступалі.

Белкалгасцэнтр паслаў падрабязную інструкцыю і плян ўборкі ўраджаю ў акралгасгасаюзы. Апошнія перасылалі інструкцыю ў раёны. Што-ж робіцца ў раёнах, як практычна ажыцьцяўляецца плян падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі на месцах?—аб гэтым ні ў Наркамземе, ні ў Белкалгасцэнтры нічога ня ведаюць.

Як ідзе завоз уборачных машын? — нашы навінен быць даведзены да кожнага калгасу, двара, пасэўшчыка. Як-жа выконваецца гэта дырэктыва? Цэнтральныя установы ня цікавяцца гэтым пытаньнем.

Як ідзе зараз уборачных машын?— Нездавальняюча. Заводы ня выканалі заказ. Прадпрыемствы Белмэталяб'яднаньня на 15 чэрвеня павінны былі даць 16.000 акучнікаў, здадзена 9.091— 57 проц. Ўкрсельмаш на 21 чэрвеня выканаў заяўку на палольнікі—плянэткі №№ 47 а нал. і 8 на 81 проц., жнівярак наступіла 76 проц., жнівярак-снопавязалак—19 проц., касарак—80 проц., конных грабель—22 проц.

Віцебскі завод «Чырвоны Мэталіст» сарваў выпуск акучнікаў да пачатку ўборачнай кампаніі. Увесь заказ на акучнікі павінен быў быць выкананы да 1 чэрвеня.

Ёсьць небясьпека, што БССР не атрымае патрэбнай колькасьці жнівярак-снопавязалак і конных грабель. Месцам трэба падумаць аб тым, каб замяніць гэтыя машыны іншымі—ручнымі граблямі, жнівяркамі і г. д.

Рамонт уборачных машын павінен быць скончаны да 1 ліпеня. Але многія майстэрні яшчэ не абсталяваны. Белпайгандаль на працягу 3-га кварталу павінен быў здаць абсталяваньня на 80.000 руб. Здадзена-ж ня больш, як на 7-10 тысяч рублёў, што зрывае арганізацыю сеткі рамонтных майстэрань.

На камітэты сялянскай узаемадапамогі ў значнай ступені ўскладзена задача па рамонце ўборачных машын бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і па аказаньні ім працоўнай дапамогі. Кожны сельскі камітэт, паводле пляну ЦК КСУ, павінен дапамагчы 20-ці бядняцкім гаспадаркам.

Па лініі камітэтаў павінна было быць арганізавана сёлета 40 новых майстэрань. Як-жа стаіць справа ў сапраўднасьці? ЦК сялянскай узаемадапамогі ня ведае, як ідзе рамонт гэтых машын і ці наогул пачаўся гэты рамонт. Няма ўліку колькі машын у бядняцкіх гаспадарках патрабуюць рамонту, колькі патрабуецца запасных часьцей і матэлю.

Весткі з месц гавораць аб тым, што камітэты сялянскай узаемадапамогі ня выконваюць дырэктывы аб пабудове кузьняў-майстэрняў на рамонце с.-г. інвэнтару. У радзе раёнаў кузьні не абсталяваны і не ўкамплектаваны патрэбным інструментам, цьвёрдых расцэнак на рамонт не ўстаноўлена. У Менскай, Магілеўскай акругах адпушчаныя крэдыты на пабудову кузьняў ня выкарыстаны. Ёсьць выпадкі, калі ёсьць будынкі для кузьняў, але няма абсталяваньня. Мясцовыя камітэты ня прымаюць энэргічных мер на мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, зборы лому, заводзкіх жалезных адкідаў і г. д.

Пры такім тэмпе работы дырэктыва ўраду аб скančэньні рамонту ўборачных машын да 1-га ліпеня ня будзе выканана.

Трэба адзначыць, што некаторыя акрвыканкомы, як Мазырскі і асабліва райвыканкомы—Капыльскі, Сьмілавіцкі і інш., замест дапамогі камітэтам у рабоце па абслугоўваньні бядняцкіх гаспадарак, прыступілі да ліквідацыі камітэтаў.

Прыведзеныя факты вельмі яскрава сьведчаць аб тым, што земельныя і калгасна - каапэрацыйныя органы яшчэ не пераключыліся на баявую падрыхтоўку да ўборкі ўраджаю.

Такую пасьлядоўнасьць надалей цярпець нельга. У радзе раёнаў ужо пачынаецца касьба. Між тым, весткі з месц гавораць аб аналёгічнай пасьлядоўнасьці ў радзе округ і раёнаў.

У нас ёсьць усе магчымасьці і ўмовы для пасьпяховага правядзеньня ўборачнай кампаніі. Трэба толькі неадкладна пераключыць гэтую работу на рэйкі ўдарніцтва, паставіўшы яе ў цэнтр увагі партыйных і савецкіх арганізацый.

Уборачная кампанія павінна быць і будзе праведзена па-бальшавіцку.

**М. К-н.**

## Гастралёрскія наскокі, замест практычнай дапамогі

У **Клічаўскім раёне**, Бабруйскай акругі, ёсьць нацыянальны польскі калгас. Ён існуе звыш 5-ці месяцаў і зьяўляецца ў Клічаўскім раёне самым буйным калектывам. Ня гледзячы на гэта, раённыя арганізацыі не зварачаюць на калгас ніякай увагі.

Калгас з посьпехам скончыў сяўбу і зараз рыхтуецца да ўборкі ўраджаю. Аднак, з-за таго, што раённыя арганізацыі не аказваюць належнай дапамогі калгасам, ёсьць пэўная пагроза, што ўборачная кампанія можа сарвацца. Калгас павінен разгарнуць будаўніцтва. Паводле пляну, павінны быць пабудаваны сьвінух на 150 сьвіней, цылятнік, сыраварня, дзьве сіласныя ямы. Калгас павінен паставіць 300 кароў. Але сродкаў для выкананьня ўсяго гэтага пляну калгас ня мае. Ніякіх паказаньняў і дапамогі няма. Для будоўлі неабходны будаўнічыя матар'ялы, а атрымаць іх няма адкуль, бо раённыя арганізацыі ня цікавяцца будаўніцтвам у калгасе, а калі і наведваюць, дык у форме гастралёрскіх наскокаў.

Было-б значна лепш, калі-б раённыя арганізацыі менш займаліся «налётамі», а больш дапамагалі калгасу на справе ў правядзеньні падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі.

Я, рабочы — «25-цітысячнік», пасланы на работу ў гэты калгас у якасьці старшыні. Усё сваё здароўе і вопыт я аддаў веснавой сяўбе і арганізацыі работы ў калгасе. Плян веснавой сяўбы калгасам поўнасьцю выкананы, а па некаторых культурах нават перавышаны. Але з-за таго, што раённыя арганізацыі не аказваюць калгасу ніякай практычнай дапамогі — вельмі цяжка працаваць. Патрэбна тэрміновае рэагаваньне.

**Старшыня нацыянальнага польскага калгасу Клічаўскага раёну СТАНКЕВІЧ.**

## Злачынная безгаспадарчасьць у саўгасе

Паводле пляну саўгас «Харапуць». Гомельскай акругі, павінен быў быць рэарганізаваны на ўзорную малочную фэрму з 3.000 штукамі жывёлы, у ім меркавалася паладзіць культурную жывёлагадоўлю. Але рэальнасьць гаворыць зусім аб іншым, чым намечаныя пляны.

Быць саўгасу, ці не?—вось як стіць зараз пытаньне. Саўгас з-за адсутнасьці нагляду трапіў у ґупік. Выкідваюцца на вецер дзесяткі тысяч рублёў. На сёньняшні дзень саўгас мае звыш 302.000 руб. дэфіцыту. Гэта вынікі гаспадараньня былога загадчыка, які зараз за развал саўгасу адданы пад суд. З 900 гэктараў засеяна ня больш паловы і то нікультурным спосабам, бяз ужываньня ўпаенняў. З-за недахвату рабочых стаяць без работы 75% коняй. У часе сяўбы валяліся нескарыстанымі дзесяткі плугоў і барон.

У саўгасе няма памяшканьняў для рабочых, няма стайняў для жывёлы і складаў для хаваньня інвэнтару. Рабочым прыходзіцца спаць у шалашах, або хадзіць на начлег за 5 кілёмэтраў.

Белсельтрэст адпусьціў 12.000 руб. на пабудову дому на 8 кватэр і двара на 300 штук жывёлы і па гэтым супакоіўся. Гэта датацыя зусім не вырашае жыцьцёвага пытаньня.

У 1928-29 годзе паляводства саўгасу з-за безгаспадарчасьці дало калі 1.900 руб. дэфіцыту, малочная гаспадарка—9.500 руб. страты, сабекошт малака быў 19 кап., а прадавалі яго за 16 кап. літр. Жыта каштавала калгасу 16 р. 70 к., сярэдні-ж сабекошт па саўгасах Белсельтрэсту 9 р. 60 к. цэнтнэр, бульба—3 р. 60 к., пры сярэдняй цане 2 р. 10 к.

Такое гаспадараньне мае месца і да сёньняшняга дня.

Белсельтрэст мяркуе зьмясьціць у саўгасе 3.000 штук жывёлы. Цікава ведаць, дзе ён знойдзе памешканьне для іх, а таксама куды будзе ссыпана 30.000 пудоў сеньняга ўраджаю аўсу?

Калі ня будуць прыняты тэрміновыя меры, саўгас зусім разваліцца. Час не чакае.

Л. О. Е. К.

## Якасьць хірургічнай апаратуры нездавальняючая

Мы раней і ня марылі аб уласнай вытворчасьці медыка - хірургічных інструмантаў. Мы былі ў поўнай залежнасьці ад Заходняй Эўропы. Зразумела, з якім вялікім здавальненьнем савецкая грамадзкасьць сустрэла весткі аб тым, што прамысловасьць Савецкага Саюзу стала на шлях вырабу мэдыка-санітарнай апаратуры.

На жаль, трэба адзначыць, што нашы гаспадарчыя арганізацыі, якія займаюцца вырабам мэдычна - хірургічных інструмантаў, зусім не зварачаюць увагі на іх якасьць, не гаворачы аб высокіх цэнах. Яны не ўсьведамляюць сваёй адказнасьці перад грамадзкасьцю.

Нашы хірургічныя клінікі часта атрымліваюць інструманты і прылады з дрэннага матар'ялу, пядбайна зробленыя, якія хутка псуюцца, зношваюцца, якія прыходзіцца замяняць новымі, недакладныя прылады, якімі нельга карыстацца.

Вось, напрыклад, цана лобных рэфлектараў, якія ўжываюцца пры агляндзе носу, горла і вуха, у некалькі раз вышэй замежных, а між тым якасьць іх такая, што нашы дактары адмаўляюцца набываць іх, хоць няма ў продажы замежных прылад.

Апарат для вызначэньня рэзэрвовай шчолачнасьці крыві каштуе 45 рублёў, зроблены неакуратна, хутка псуецца, дрэнна прыгнаны шклянны крант, наогул апарат хутка выходзіць са строю. «Дзяржлябарабезьпячэньне» ў Маскве, як відаць, зусім не зацікаўлена ў забесьпячэньні лекавых устаноў добрым інструмантам.

Трэба, каб органы рабоча - сялянскай інспэкцыі зацікавіліся гэтым пытаньнем і прынялі меры, каб дабіцца палепшэньня якасьці мэдычна - хірургічнай апаратуры.

Праф. **БУРАК.**

*Будаўнічы сэзон*

# Тармазы на шляху зьніжэньня сабекошту будаўніцтва

**Перад выпускам пазыкі „Пяцігодка ў 4 гады“**

## ПРАДЗЕДАЎСКІЯ КОЗЛЫ—ЗАМЕСТ МАШЫН

**Мэханізацыя будаўніцтва праводзіцца вельмі дрэнне**

Партыя і савецкая ўлада далі рад дырэктыў аб зьніжэньні сабекошту будаўніцтва. Будаўнічы індэкс павінен быць зьніжаны ў гэтым годзе на 14 проц. Але гэтыя дырэктывы ня выконваюцца нашымі будаўнічымі арганізацыямі. Белдзяржбудаб'яднаньне зьнізіла сабекошт будаўніцтва ў г. г. на 2,5 проц., Менбуд — на 5,86%, а ў Белжылсаюзе зусім няма вестак аб зьніжэньні сабекошту. Можна быць упэўненым, што будаўніцтва Белжылсаюзу дае яшчэ больш нізкі процант зьніжэньня.

Нашы будаўнічыя арганізацыі вельмі мала ўвагі аддаюць рацыяналізатарскім мерапрыемствам. Праекты будаўніцтва рэдка абгаворваюцца на вытворчых рабочых нарадах.

Па лініі Белдзяржбуду мэханізавана ўсяго толькі 25 проц. будаўнічых работ, але і гэта справа стаіць вельмі дрэнна.

Па лініі Белдзяржбуду мэханізавана ўсяго толькі 25 проц. будаўнічых работ, гэта ў той час, калі Белдзяржбуд зьяўляецца буйнейшай будаўнічай арганізацыяй Беларусі. На будаўніцтве Менбуду мэханізавана толькі 10 проц. работ — 26 аб'ектаў. Асабліва дрэнна праводзіцца мэханізацыя на пабудовах Белжылсаюзу. Прадзедаўскія козлы і насілкі яшчэ шырока ўжываюцца на будаўнічых работах Белжылсаюзу. Нават тыя машыны, якія ёсьць, не скарыстоўваюцца. Ужо 2 месяцы валяюцца на складзе 5 электра - матораў, 2 лябёдкі. Старшыня праўленьня Белжылсаюзу на запытаньне нашага супрацоўніка адказаў, што «мы іх і ня думаем скарыстоўваць».

Між тым, мэханізацыя работ дае вялікую эканомію сродкаў. Вось маленькі прыклад. Менбуд падлічыў, што адна пад'ёмная машына, апрача сацыяльнага эфэкту (палягчэньня работы рабочых) за 2 месяцы работы пакрыла ўсе выдаткі і дала 160 руб. эканоміі.

Значна тармозяць мэханізацыю будаўнічых работ пядбайныя адносіны трэсту «Строймеханизация» ў Маскве і гомельскага заводу «Пралетары» да заказаў будаўнічых арганізацый. «Строймеханизация» ўпарта ня выконвае заказаў Белдзяржбуду, які іжнуўся мэханізаваць 50 проц. усіх будаўнічых работ.

Прафарганізацыі саюзу будаўнікоў павінны самым сур'ёзным чынам заняцца пытаньнем зьніжэньня сабекошту будаўніцтва. Трэба ажывіць дзейнасьць вытворчых нарад на пабудовах, мабілізаваць рабочую думку вакол прарываў у выкананьні якасных паказальнікаў капітальнага будаўніцтва.

**І. ЛЯЎКОВІЧ.**

## Будаўніцтва не разгорнута

**Ня зжыты канкурэнцыя і пераманьваньне рабочых**

**Будаўнічыя работы па г. Бабруйску дагэтуль не разгорнуты. Плян будаўніцтва выконваецца надзвычай слаба. Будаўнічыя арганізацыі — Жылсаюз, Прамтрэст, Белдзяржбуд—не дагаварыліся паміж сабой, паміж імі вядзецца нездаровая канкурэнцыя, кожны цягне да сябе будаўнічыя матар'ялы—у выніку няма вучоту, якія матар'ялы патрэбны, колькі іх не хапае, зрываецца ўсякі плян. Ня зжыта пераманьваньне рабочых аднэй будаўнічай арганізацыяй ад другой.**

**На будаўнічых работах вельмі слаба праводзяцца рацыяналізатарскія мерапрыемствы, прафсаюзныя арганізацыі і парт'ячэйкі мала што робяць, каб мабілізаваць масы вакол пытаньняў сацспаборніцтва і ўдарніцтва.**

**Цагельні № 1 -2 ня ўжылі мер, каб выканаць вытворчыя пляны. Ёсьць пагроза, што за гэты сэзон будзе недавыраблена 4 мільёны цэглы. Тлумачыцца гэта тым, што гаспадарнікі зусім ня цікавяцца выкананьнем дырэктыў аб фарсаваньні вырабу будаўнічых матар'ялаў.**

**Абслугоўваньне будаўнікоў - сэзоньнікаў вельмі дрэннае. Амаль нідзе не арганізаваны сталоўні, і рабочыя харчуюцца толькі хлебам і сітро. Няма інтэрнатаў, многія сьпяць на вуліцах, капя месца пабудовы.**

**Не наладжана культурна-масавая работа. Трэба было рэалізаваць пазык на 170.000 рублёў, рэалізавана на 4.000.**

**Ёсьць выпадкі выплаты зарплаты са спазьненьнем на тыдзень.**

**За невыкананьне дырэктыў аб паляпшэньні абслугоўваньня рабочых прыцягваюцца да крымінальнай адказнасьці кіраўнікі акружсаюзу і прамысловага трэсту.**

**Р—н.**

*На пленуме ЦСПСБ*

# Выканаць дырэктыву партыі аб рэальным павышэньні зарплаты

Пытаньне аб рабочым забесьпячэньні абмяркоўвалася на папярэднім пленуме ЦСПСБ, яно было адным з асноўных пытаньняў і на IX пленуме, які асноўную ўвагу аддаў таму, ці выканалі каапэрацыйныя арганізацыі дырэктывы партыі аб павышэньні рэальнай зарплаты.

У спрэчках па дакладзе Наркамгандаль БССР тав. Балціна члены пленуму канстатавалі, што дырэктывы ня выкананы. Напрыклад, ня выканана дырэктыва аб тым, каб паставіць па адкорм 80.000 сьвіней і 25.000 галоў буйное жывёлы. Ня выканана дырэктыва аб паляпшэньні грамадзкага харчаваньня. Абслугоўваючы нэрсанал сталовых выклікае правільныя нарэканьні. Грубасьць, нетактоўнасьць яшчэ ня зьнішчаны. У сталовых бясконцыя чэргі. Ня гледзячы на тое, што пасьпела гародніна, у сталовых звычайна ёсьць адзін толькі селядзец.

У Віцебску ў рабочым раёне, каля вакзалу, дзе знаходзіцца 6.000 рабочых, ёсьць толькі некалькі маленькіх сталовых, з якіх кожная можа абслужыць ня больш 200 чалавек, а новую сталовую чамусьці пабудавалі ня ў гэтым рабочым раёне.

У часе агляду грамадзкага харчаваньня рабочыя брыгады выкрылі рад буйных недахопаў і ўнесьлі шмат каштоўных прапаноў. Але гэтыя прапановы ня выкананы. Як і раней, вельмі востра стаіць пытаньне аб кадрах для сталовых. Галоўным чынам не хапае кухароў. Апрача таго, далейшае пашырэньне сеткі сталовых тармозіцца ў сувязі з адсутнасьцю патрэбнага абсталяваньня. Беларуская прамысловасьць-жа ўпарта адмаўляецца ад удзелу ў выробе абсталяваньня для сталовых.

Ня выканана дырэктыва аб стварэньні садова - гародніх гаспадарак. Каапэрацыя ня ўлічыла карысьці, якую можна атрымаць ад разьвіцьця гародніх гаспадарак. Што датычыць прафсаюзных арганізацый, дык іх удзел у гэтай справе не насіў канкрэтнага характару. Далей дакладу і рэзалюцыі прафсаюзы не пайшлі.

Каапэрацыя мала цікавіцца павышэньнем рэальнай зарплаты рабочых. У некаторых гарадох каапэрацыйныя арганізацыі маюць толькі адну мэту — павялічэньне прыбытку. Нават сталовыя, якія ўвесь час былі дэфіцытнымі, у апошнія гады прынесьлі вялікі прыбытак. Такія адносіны каапэрацыі ўпна недапушчальны.

Саматужная каапэрацыя таксама за апошні час ня зьніжае цаны, а павялічвае.

Мала ўвагі аддаецца якасьці прадукцыі, што таксама б'е па кішэні рабочых. Не хапае рамонтных майстэрняў. Каб паправіць пару абутку можна парваць другія, ходзячы па каапэрацыйных камісіях і ЦРК.

Амаль нічога ня робіцца для скарыстаньня мясцовых прадуктовых рэсурсаў для замены дэфіцытных прадуктаў. «Белрыба» выканала плян улову рыбы толькі на 26 проц. Зусім слаба разгортваецца маргарынавая прамысловасьць. Беларусь багата фруктамі, але чамусьці, нават, у разгары сэзону іх не хапае і трэба ўвозіць фрукты з Крыму. Таксама мала хто думае аб перапрацоўцы фруктаў.

Члены пленуму выступілі з радам прапаноў аб паляпшэньні рабочага забесьпячэньня і неабходнасьці максымальнай мабілізацыі мясцовых прадуктовых рэсурсаў.

## Дрэнна зямляўпарадкаваны калгасы

У **Горацкім** раёне налічваецца 58 калгасаў. Але да гэтага часу яшчэ не распачата работа на зямляўпарадкаваньні калгасаў. Раённы земельны аддзел да гэтага часу яшчэ не паслаў у вёску каморнікаў для аказаньня дапамогі індывідуальнаму сэктару і калгасам, бо да гэтага часу ня ведаюць як калгасьнікі, так і індывідуальнікі, дзе каму касіць сенажаць і інш.

**Элькін.**

# Перад рэалізацыяй пазыкі „Пяцігодка ў 4 гады“

*Правесьці перавыбары камісій садзейнасьці,*

**узмацніць склад іх добрымі працаўнікамі**

Пасьпяховае правядзеньне рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка ў 4 гады» і абмен облігацый ранейшых пазык патрабуе, каб камісіі садзейнасьці дзяржкредыту ашчаднай справе, як у горадзе, так у вёсцы неадкладна перабудавалі работу, перайшлі ад кампанейскіх мэтадаў да мэтаду пастаяннага актыўнага выкананьня важнейшых задач дзяржкредыту.

Ня гледзячы на рад дырэктыў цэнтральнай камісіі садзейнасьці пры ЦВК БССР аб актывізацыі работы пізаных камісій, аб згуртаваньні вакол камісій ўвагі грамадзкасьці, мы ня бачым шчэ пералому ў іх рабоце.

Матар'ялы, якія паступаюць у цэнтральную камісію гавораць аб тым, што пізаныя камісіі садзейнасьці дапускаюць ад грубых памылак пры ажыцьцяўленьні грамадзкага кантролю. Неразуменьне задач грамадзкага кантролю даходзіць да таго, што некаторыя камісіі вельмі лёгка даюць дазвол на распродаж аблігацый, а другія падмяняюць грамадзкі кантроль адміністрацыйным вырашэньнем пытаньня.

Пры абсьледваньні выяўлены факты выдачы дазволу на продаж і заклад аблігацый у мэтах пакрыцьця растраты, набыцьця вопраткі, выплаты аліментаў. Зразумела, што вялікую частку віны нясуць і крэдытныя ўстановы, фінорганы, праз якія праходзяць справы на продажы, закладзе аблігацый, якія павінны нагледаць за выкананьнем дырэктыў ураду. Крэдытныя ўстановы павінны своячасова сыгналізаваць грамадзкасьці аб памылках сабных камісій.

Трэба адзначыць, што камісіі садзейнасьці зусім нездавальняюча праводзяць растлумачальна - папулярызацыйную работу. Пазыкатрымальнікі часта ня ведаюць куды ім зварочацца з дазвол на продаж і заклад аблігацый, куды падаваць скаргі на пастановы камісіі. Выразным прыкладам неыстарчальнай інфармацыі можа служыць той факт, што дагэтуль пазыкатрымальнікі СССР не атрымалі выйнцыяў і процантаў па пазыках на 3 млн. руб. Кампанейскія мэтады работы прывялі да таго, што посьпехі ў правядзеньні месячніка ашчаднасьці не замацаваны і не паглыбляюцца. Па лініі прадпрыемстваў значна зьменшыся наступленьне грошай на індывідуальных абавязацельствах.

Надыходзячая кампанія пашырэньня пазыкі «Пяцігодка ў чатыры гады» і абмену ранейшых пазык патрабуе асабліва выразнай работы камісій садзейнасьці. Трэба будзе разгарнуць шырокую растлумачальна - агітацыйную работу сярод усіх колаў насельніцтва. **Трэба таму ўзмацніць склад пізаных камісій садзейнасьці аўтарытэтнымі, здольнымі, вымаганымі таварышамі, трэба на працягу бліжэйшых тыдняў правесьці перавыбары камісій садзейнасьці.**

**Б. ВАНСОЎСКІ.**

## Камісіі садзейнасьці—апорныя пункты крэдытнай работы

**1-га ліпеня пачынаецца кампанія рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка ў чатыры гады» і абмену ранейшых масавых пазык на новую пазыку. Гэта кампанія ляжыць рад сур'ёзных абавязкаў на ...е грамадзкія арганізацыі, галоўным ...ынам, на пізаныя камісіі садзейнасьці.**

**Трэба забясьпечыць максымальную ...дзейнасьць ходу кампаніі. Даклады ...пазыцы неабходна паставіць на па...**

## Брак павялічваецца

На гуце «Ільпіч», Быхаўскага раёну (агілеўшчына), брак павялічваецца. Па ...ачнай пасудзе брак дасягае ў сярэдзе 5 проц. замест 3,1 проц., прадугледжаных планам. На гаспадарчым ...ніні брак даходзіць да 11 проц., замест 5,9 проц. Усе гэта зьяўляецца таму, што адміністрацыя нядбайна адносіцца да сваіх абавязкаў, часта мяняецца рабочая сіла, адсутнічае дысцыпліна і назіраюцца масавыя прагулы. Апрача гэтага дрэнна абстаўлена і абсталяваньнем і інструмантам.

Саўком і вытворчая камісія нічога ня робяць для выкананьня прамфінпляну. Неадкладна трэба ліквідаваць пана...ньні непармальнасьці.

**С.**

**...ЧЭ 7-га чэрвеня даў рад ...рэктыў аб свайчасовай ...ўборачнай кампаніі. З ...шло ўжо два тыдні. ...ца гэтыя дырэктывы?**

**УСЕ СІ...**

...ая работа праходзіць ...ам. Грамадзкасьць не ...ізовыя сыгналы ...гэтай важнейшай ...ая зоўля рыбы ў ...гасцэнтр, каапэра- ...арвала. На 10 чэр... праяўляюць неда- ...выканаў усяго на 2... ...ць да выканаўня ...Чы... ...мерствах, вызначаных урадам.

У Наркамземе дагэтуль няма канкрэтнага пляну дапамогі бядняцка-серадняцкім гаспадаркам у часе ўборкі ўраджаю.

Да 15 чэрвеня ў калгасах павінны былі быць ужо арганізаваны брыгады па ўборцы і малацьбе. На сёньняшні дзень у большасьці калгасаў гэтых брыгад няма. Да іх арганізацыі, нават, і не прыступалі.

Белкалгасцэнтр паслаў падрабязную інструкцыю і плян ўборкі ўраджаю ў акралгасгасаюзы. Апошнія перасылалі інструкцыю ў раёны. Што-ж робіцца ў раёнах, як практычна ажыцьцяўляецца плян падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі на месцах?—аб гэтым ні ў Наркамземе, ні ў Белкалгасцэнтры нічога ня ведаюць.

Як ідзе завоз уборачных машын? — нашы навінен быць даведзены да кожнага калгасу, двара, пасэўшчыка. Як-жа выконваецца гэта дырэктыва? Цэнтральныя установы ня цікавяцца гэтым пытаньнем.

Як ідзе зараз уборачных машын?— Нездавальняюча. Заводы ня выканалі заказ. Прадпрыемствы Белмэталяб'яднаньня на 15 чэрвеня павінны былі даць 16.000 акучнікаў, здадзена 9.091— 57 проц. Ўкрсельмаш на 21 чэрвеня выканаў заяўку на палольнікі—плянэткі №№ 47 а нал. і 8 на 81 проц., жнівярак наступіла 76 проц., жнівярак-снопавязалак—19 проц., касарак—80 проц., конных грабель—22 проц.

Віцебскі завод «Чырвоны Мэталіст» сарваў выпуск акучнікаў да пачатку ўборачнай кампаніі. Увесь заказ на акучнікі павінен быў быць выкананы да 1 чэрвеня.

Ёсьць небясьпека, што БССР не атрымае патрэбнай колькасьці жнівярак-снопавязалак і конных грабель. Месцам трэба падумаць аб тым, каб замяніць гэтыя машыны іншымі—ручнымі граблямі, жнівяркамі і г. д.

Рамонт уборачных машын павінен быць скончаны да 1 ліпеня. Але многія майстэрні яшчэ не абсталяваны. Белпайгандаль на працягу 3-га кварталу павінен быў здаць абсталяваньня на 80.000 руб. Здадзена-ж ня больш, як на 7-10 тысяч рублёў, што зрывае арганізацыю сеткі рамонтных майстэрань.

На камітэты сялянскай узаемадапамогі ў значнай ступені ўскладзена задача па рамонце ўборачных машын бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і па аказаньні ім працоўнай дапамогі. Кожны сельскі камітэт, паводле пляну ЦК КСУ, павінен дапамагчы 20-ці бядняцкім гаспадаркам.

Па лініі камітэтаў павінна было быць арганізавана сёлета 40 новых майстэрань. Як-жа стаіць справа ў сапраўднасьці? ЦК сялянскай узаемадапамогі ня ведае, як ідзе рамонт гэтых машын і ці наогул пачаўся гэты рамонт. Няма ўліку колькі машын у бядняцкіх гаспадарках патрабуюць рамонту, колькі патрабуецца запасных часьцей і матэлю.

Весткі з месц гавораць аб тым, што камітэты сялянскай узаемадапамогі ня выконваюць дырэктывы аб пабудове кузьняў-майстэрняў на рамонце с.-г. інвэнтару. У радзе раёнаў кузьні не абсталяваны і не ўкамплектаваны патрэбным інструмантам, цьвёрдых расцэнак на рамонт не ўстаноўлена. У Менскай, Магілеўскай акругах адпушчаныя крэдыты на пабудову кузьняў ня выкарыстаны. Ёсьць выпадкі, калі ёсьць будынкі для кузьняў, але няма абсталяваньня. Мясцовыя камітэты ня прымаюць энэргічных мер на мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, зборы лому, заводзкіх жалезных адкідаў і г. д.

Пры такім тэмпе работы дырэктыва ўраду аб скančэньні рамонту ўборачных машын да 1-га ліпеня ня будзе выканана.

Трэба адзначыць, што некаторыя акрвыканкомы, як Мазырскі і асабліва райвыканкомы—Капыльскі, Сьмілавіцкі і інш., замест дапамогі камітэтам у рабоце па абслугоўваньні бядняцкіх гаспадарак, прыступілі да ліквідацыі камітэтаў.

Прыведзеныя факты вельмі яскрава сьведчаць аб тым, што земельныя і калгасна - каапэрацыйныя органы яшчэ не пераключыліся на баявую падрыхтоўку да ўборкі ўраджаю.

Такую пасьлядоўнасьць надалей цярпець нельга. У радзе раёнаў ужо пачынаецца касьба. Між тым, весткі з месц гавораць аб аналёгічнай пасьлядоўнасьці ў радзе округ і раёнаў.

У нас ёсьць усе магчымасьці і ўмовы для пасьпяховага правядзеньня ўборачнай кампаніі. Трэба толькі неадкладна пераключыць гэтую работу на рэйкі ўдарніцтва, паставіўшы яе ў цэнтр увагі партыйных і савецкіх арганізацый.

Уборачная кампанія павінна быць і будзе праведзена па-бальшавіцку.

**М. К-н.**

## Дапамажэце падрыхтоўцы кадраў

**Адкрыты ліст да рабочых дзярждрукарні імя Сталіна**

Шпаркі тэмп сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі патрабуе вырашэньня адной з найбольш цяжкіх праблем—пытаньня аб кадрах. Справа гэта тармозіцца з-за недахвату добрых падручнікаў навучальных прылад і г. д. З году ў год падручнікі ў продаж паступаюць са значным спазьненьнем. Навучальныя ўстановы прыступаюць да работы без адпаведных прылад.

Патрэба ў ідэалёгічна вытрыманым падручніку паставіла перад Наркамасьветы задачу перагляду і пераапрацоўкі ўсіх падручнікаў у адпаведнасьці з генэральнай лініяй партыі. З гэтай мэтай НКА мабілізаваў рад культурных працаўнікоў і даручыў ім пераапрацоўку навучальных кніжак. Але гэта работа ўпіраецца ў паліграфічную базу —заказы па выданьні літаратуры выконваюцца з вялікім спазьненьнем, тэмп выданьня падручнікаў пагражае зрывам навучальнага году.

Дзеля таго, каб навучальныя ўстановы маглі выканаць свае вытворчыя пляны, НКА зварачаецца да рабочых друкароў з просьбай прыняць усе меры да ліквідацыі прарываў, дабіцца надрукаваньня падручнікаў не позьней 15-га жніўня.

**Нам. Наркамасьветы РЫЎЛІН.**

# ПАД СЬЦЯГАМ БАЛЬШАВІЦКАЙ САМАКРЫТЫКІ

## прайшла самаправерка на заводзе „Пралетары“

**Масавая самаправерка дала рост энтузіязму рабочых і павялічэньне прадукцыйнасьці працы**

**Выкананьне шматлікіх прапаноў праверачных брыгад—верны шлях да перавыкананьня прамфінпляну**

### СЛОВА 200 ПРАЛЕТАРАЎ

Падагульваючы рэзультаты самаправеркі па гомельскім машына-будаўнічым заводзе **«Пралетары»**, заводзкая газэта **«Чырвоная Вагранка»** адзначае **рад асобных недахопаў** у самой самаправерцы. Удзел добраахвотнікаў быў невыстарчальны, частка добраахвотнікаў адмовілася ад удзелу ў самаправерцы, процант камсамольцаў і партыйцаў у самаправеравчых брыгадах быў невялікі, сакратары і эканомработнікі цэхавых камсамольскіх ячэек дэзэртавалі з самаправеравчых брыгад, наміж цэхавымі партыйнымі і прафэсыянальнымі арганізацыямі ня было ўзгодненасьці. Але, ня гледзячы на гэта, самаправеравчыя брыгады наогул **справіліся са сваімі задачамі** і добра прапрацавалі пытаньні ўдарніцтва, выкананьня вытворчых заданьняў і сацспаборніцтва.

З гэтай ацэнкай самаправеркі можна **цалкам згадзіцца**. Даволі пераглядзець вывады часовай кантрольнай камісіі заводу «Пралетары», якія, дарэчы, займаюць **34 старонкі друкаваныя на машынцы**, каб упэўніцца, што самаправеравчыя брыгады **прарабілі вялікую работу**. Асабліва каштоўнымі гэтыя вывады зьяўляюцца таму, што адначасова з дзелавым і канкрэтным аналізам стаповішча прадпрыемства, вывады ўносяць **рад прапаноў**, выкананьне якіх павінна зрабіць значны пералом у рабоце заводу. Такіх прапаноў **амаль на 20 старонках** высунута **роўна 211**, прычым самаправеравчыя брыгады не прайшлі міма **ні аднэй галіны работы прадпрыемства**, пачынаючы працдысцыплінай і канчаючы плянаваньнем вытворчасьці.

### САМАПРАВЕРКА МАБІЛІЗАВАЛА МАСЫ

Усяго на заводзе было арганізавана 12 праверачных брыгад з 188 удзельнікамі, у тым ліку 33 партыйцы і 38 камсамольцаў, хаця ўдзел апошніх мог быць значна большым.

Значную дапамогу самаправеравчым брыгадам аказалі заводзкія арганізацыі, якія распрацавалі **для кожнай брыгады канкрэтныя заданьні і праграму работ па самаправерцы**. Потым вывады і прапановы самаправеравчых брыгад былі настаўлены на абгаварэньне цэхавых сходаў і былі дапоўнены новымі дзесяткамі прапаноў з боку рабочых, якія непасрэднага ўдзелу ў самаправерцы ня прымалі. Такая **масавая прапрацоўка** вынікаў самаправеркі дала штуршок для арганізацыі новых ударных брыгад і перазаключэньня сацдагавораў, узьняла зацікаўленасьць рабочых выкананьнем прамфінпляну, што знайшло свой адбітак у арганізацыі камуністычных цэхаў, а таксама у лепшым выкананьні вытворчай праграмы за май у параўнаньні з красавіком: у красавіку—96,4 проц., у маі 98,5 проц. Улічваючы напружанае становішча з забесьпячэньнем у маі матар'ялямі (асабліва швэлярным жалезам), трэба сказаць, што завод **за гэты месяц працаваў параўнальна** добра, хоць і недавыканаў вытворчую праграму на 1,5 проц.

### ПАД СЬЦЯГАМ ДЗЕЛАВОЙ САМАКРЫТЫКІ

Але асноўная паслуга самаправеравчых

# Пад знакам росту

## Саматужная каапэрацыя БССР — на парозе 4-га кварталу

У друку паведамлялася ўжо аб прарывах у выкананьні прамфінпляну прамысловай каапэрацыяй БССР. За першы квартал бягучага году гадавы плян каапэраваньня ў арцелях выкананы усяго на 8,8%.

Але другі квартал даў значны пералом як у адносінах колькасных, так і ў якасных паказальнікаў. У тоў час, калі першы квартал даў прырост каапэраваных членаў арцеляй на 1.338 чалавек, дык за другі квартал уцяпнута ў прамысловыя арцелі звыш 4.000 чалавек. Такім чынам, за час з 1-га кастрычніка мінулага году па 1-га красавіка г. г. лік членаў арцеляй павялічыўся на 5.380 чалавек. **Гадавы плян** выкананы на 35,2%.

Зноў прынятых каапэраваных саматужнікаў — 200 гарадзкіх жыхароў і 3.380 местачковых і вясковых. Такім чынам разьвіцьцё прамысловай каапэрацыі ідзе ў адпаведнасьці з дырэктывамі аб уцягненьні ў саматужную каапэрацыю местачковай беднаты, бядняцкай і серадняцкай часткі вясковага насельніцтва.

Лік членаў арцеляй, якія працуюць на мясцовым, недэфіцытным сырцы, узрос за першае паўгодзьдзе на 3.400 чал. За гэты-жа час арцелі дэфіцытных промыслаў павялічыліся менш чым на 2.000 чалавек. Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што выконваецца пастанова ЦК УсеКП(б) аб перанясьненьні ўвагі на промыслы, якія базуюцца на мясцовым недэфіцытным сырцы.

Некаторы пералом мы маем у адносінах **накапленьня ўласных сродкаў.** Другі квартал даў прырост пайвых узносаў у арцелях на 248.000 рублёў, супроць 140.000 у першым квартале.

Буйны прарыў мы маем у дрэваапрацоўчай саматужнай прамысловасьці. Аношняя ўзрасла за першае паўгодзьдзе толькі на 921 чалавек, прамфінплян меркаваў павялічэньне на 5.000 чалавек,—выканана каля 19% пляну.

Гэта тлумачыцца галоўным чынам нагардлівымі адносінамі Лесбелу да прамысловай каапэрацыі. Лесбел зусім ня выконвае абавязкаў, узятых на сябе наводле дагавораў. Дагавары на дастаўку лесаматар'ялаў выканаены за першае паўгодзьдзе толькі за 35%. Рад арцеляй нічого ня робяць, некаторыя працавалі выключна за кошт запасаў мінулага году.

Асаблівае ўвагі заслугоўваюць наступныя факты. Арцелі сыстэмы Белсампрамсаюзу выпрацоўваць паганялкі, патрэбныя тэкстыльнай прамысловасьці. Гэтыя паганялкі раней увозіліся з-за мяжы. У гэтым годзе арцелі павінны былі выпрацаваць 1.690.000 штук паганялак. Аднак, Лесбел да канца 1-га паўгодзьдзя зусім не забясьпечваў арцелі сырцом. Рад галін дрэваапрацоўчага промыслу не маглі разгарнуцца з-за адсутнасьці сырцу. 10.000 куб. мэтраў драўніны, якія Белсампрамсаюз павінен быў атрымаць, згодна пастановы ВСНГ, на забесьпячэньне арцеляй на выпрацоўцы гонтаў, Лесбелам не адпушчаны.

Такія адносіны Лесбелу тармозяць разьвіцьцё вясковага сэктару прамысловай каапэрацыі, бо дрэваапрацоўчы промысел разгортваецца галоўным чынам у вясковых мясцовасьцях.

* * *

Другое паўгодзьдзе павінна паслужыць экзаменам для сыстэмы саматужнай каапэрацыі—ці можа яна выкапаць узятыя на сябе абавязацельствы. Досыць сказаць, што за 2-е паўгодзьдзе арцелі Белсампрамсаюзу павінны даць дзяржаве 35 мільёнаў штук цэглы. Трэба таму дабіцца 100% забесьпячэньня арцеляй сырцом, згодна прамфінпляну. Трэба зламаць усе рагаткі, якія ставяць перад сыстэмай саматужнай каапэрацыі.

**Рафальсон.**

# Абавязковае страхаваньне засеваў ільну ад засухі

## Пастанова СНК БССР

**У разьвіцьцё пастановы Савету Працы і Абароны ад 16 верасня г. г. («Известия ЦИК СССР» ад 17-VI-1930 г.), Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:**

1. Для заахвочваньня засеваў ільну ўстанавіць на 1930 год у БССР абавязковае акладное страхаваньне ад засухі насеваў ільну.

2. Засевы ільну страхуюцца Дзяржстрахам ад засухі бяз усякіх страхавых узносаў на гэтым страхаваньні насеўшчыкамі ільну—калгасамі і індывідуальнымі бядняцка - серадняцкімі гаспадаркімі. На страхаваньні засеваў ільну ў кулацкіх гаспадарках засеўшчыкі плацяць страхавыя ўзносы ў разьмеры 9 проц. са страхавой сумы.

3. Калі ўраджай ільну-даўгунца (салома разам з насеньнем) з прычыны засухі будзе ніжэй наступных разьмераў у цэнтн.:

— У Полацкай, Аршанскай, Віцебскай і Магілеўскай—17 у калгасным сэктары і 15 у індывідуальным; у Менскай і Бабруйскай акругах—16 у калгасах і 14 у індывідуальным сэктары, у Мазырскай і Гомельскай —15 у калгасным сэктары і 13 у індывідуальным—дык Дзяржстрах аплачвае пацярпеўшаму засеўшчыку розьніцу паміж паказанымі разьмерамі ўраджаю і фактычна сабраным з разьліку 6 р. 50 к. за цэнтн.

На страхаваньні ільну-кудрашу Дзяржстрах нясе адказнасьць толькі за недабор насеньня. Калі збор насеньня з 1 гэктару будзе менш ад 3 цэнтн., дык Дзяржстрах аплачвае насеўшчыку розьніцу паміж паказанай колькасьцю і фактычным зборам насеньня з разьліку 11 руб. за цэнтн.

4. Канчатковым тэрмінам узносаў страхавых плацяжоў кулацкімі гаспадаркамі на страхаваньні ільну ад засухі ўстанавіць 1 лістапада 1930 г. За неўнясеньне ў пказаны тэрмін плацяжу налічваць пеню ў разьмеры 0,2 проц. за кожны пратэрмінаваны дзень. Няўнесеныя ў тэрмін плацяжы і пеня спаганяюцца прымусовым парадкам.

Старшыня СНК БССР **М. Галадзед.**

Кіраўнік Спраў **М. Калевіч.**

# Зрываюць сіласаваньне

З сіласаваньнем ў Магілеўскім раёне дрэнна. Райкалгасаюз і райземчастка Магілеўскага РВК бюракратычна адносяцца да гэтай справы. Камсамольская арганізацыя пачала шырокую падрыхтоўчую работу да пабудовы сіласных ям, але падтрыманьня з боку адпаведных арганізацый не сустракае. Такім чынам сіласаваньне ў Магілеўскім раёне арыванні.

**А. Шчарбакоў.**

# МЕНСК

## Прапетарызацыя ВНУ і тэхнікумаў

Паводле вестак Наркамасьветы, у гэтым годзе ў ВНУ і тэхнікумы БССР будзе прынята звыш 10.000 чалавек. Рабочымі і іх дзецьмі навучальныя ўстановы будуць укамплектаваны толькі на 30 проц., бо курсы на падрыхтоўцы рабочых у тэхнікумы і ВНУ выпусьцяць ня больш 3.000 чалавек.

Нохапаючы процант прыдзецца набіраць з ліку іншых, падаўшых заявы, зрабіўшы належны сацыяльны адбор.

## Вышэйшыя прамысловыя курсы

З 1-га кастрычніка ў Менску адкрываюцца ўсебеларускія вышэйшыя прамысловыя курсы для падрыхтоўкі кіруючых работнікаў прамысловасьці на 60 чалавек. Тэрмін навучаньня—1 год.

## Беларуская дэлегацыя на міжнароднай канфэрэнцыі швэйнікаў

У канцы ліпеня ў Маскве адбудзецца міжнародная канфэрэнцыя рэвалюцыйных рабочых-швэйнікаў. Ад БССР на канфэрэнцыю паедуць 2 рабочыя швэйных фабрык «Кастрычнік» і імя Дзяржынскага.

## Перападрыхтоўка эканамістых

У хуткім часе Наркамасьветы адкрывае ў Менску курсы на перападрыхтоўцы эканамістых-практыкаў, якія скончылі прававыя факультэты ВНУ і працуюць на пасадах эканамістых. На курсы будзе прынята 100 чалавек. Тэрмін навучаньня—1 год.

## Рэгістрацыя чорнарабочых на біржы

Менская біржа працы пашырыла кола асоб, якія рэгіструюцца на біржы. Зараз на вучот бяруцца сэзонныя чорнарабочыя мужчыны пры праяўленьні даведкі аб праве голасу і чым займаўся дагэтуль.

## Закрыліся курсы журналістых

Закрыліся 3-хмесячныя курсы журналістых пры Камвузе імя Леніна. Курсы скончыла 20 маладых газэтных работнікаў, з іх значная частка вылучаецца. Курсанты гэтымі днямі выяжджаюць на вытворчую экскурсію на 10 дзён у Маскву і Гомель. У Маскве, у Дзяржаўным Інстытуце журналістыкі (ГІЖ) курсантам будуць прачытаны некалькі лекцый, а матэрыял педагогіцы усё пройдзенае ў Менску.

# Усесаюзная выстаўка саўгасна-батрацкага нізавога друку

Рэдакцыя «Сельска-гаспадарчага рабочага» (орган ЦК с.-г. л. р.) арганізуе Усесаюзную выстаўку саўгасных, батрацкіх і лясных насьценгазэт і шматтыражак.

**Выстаўка адкрываецца 15 ліпеня ў Маскве, у парку Культуры і Адпачынку.**

**10-ці лепшым насьценгазэтам за актыўны ўдзел у сацспаборніцтве, ударніцтве і за добрую работу з рабкорамі і чытачамі выдаюцца прэміі. Першыя 5 прэмій:**

**1. Месячная практыка для аднаго выбранага на рабочым сходзе рабкора-ўдарніка ў газэце «Сельска-Хозяйственный Рабочий» і інш. выданьнях ЦК саюзу.**

**2. «Рабоче-Крестьянскій Корреспондент» на адзін год.**

**3. Бібліятэка палітычнай і мастацкай літаратуры—30 назваў. Другія 5 прэмій:**

**1. Шилграф.**

**2. «Рабоче-Крестьянсій Корреспондент» на адзін год.**

**3. Бібліятэчка—20 назваў.**

Для прысуду прэмій складаецца журы (камісія) з 5 рабкораў, 2-х прадстаўнікоў рэдакцый нацыянальных батрацкіх газэт і 1-го прадстаўніка ад «С.-Х. Рабочего».

Рэдакцыя просіць рэдкалегіі і рабкомы прысылаць на 1-2 нумары выпушчаных у вас насьценгазэт ці фатаграфі іх па адрасе: Масква, Салянка, 12, Дварэц Труда, пак. № 231, для выстаўкі.

**Рэдакцыя «Сельско-Хозяйст. Рабочего».**

# СПОРТ

— На Усесаюзную нараду на пытаньнях работы фізкультурных тэхнікумаў, якая адбудзецца ў Маскве 30 чэрвеня, выяжджае прадстаўнік ВСФКБ д-р **Душман.**

— 23 чэрвеня ў Менску адбудуцца міжнародныя спаборніцтвы на лёгкай атлетыцы паміж камандамі клюбных і прафсаюзных гурткоў.

— Пры Беларускім тэхнікуме фізкультуры арганізаваны брыгады для дапамогі фізкультурнаму выхаваньню рабочых Менскіх прадпрыемстваў.

— У саўгасах і калгасах БССР арганізуюцца 12 медычных габінэтаў для дасьледваньня фізкультурнікаў.

# Паведамленьні

## СЕНЬНЯ

**Сад Асьветы.** Кіно—«Гэтэль Савой» і культ. фільм «Зямля Кліча», пач. а 8 з пал. гадз. веч.

**Бібліятэка Дому Асьветы** з прычыны перавучоту будзе зачынена з 25-VI па 20-VII г. г.

**Дом Камасьветы.** У пак. № 19—групавая кансультацыя аб рабочым забесьпячэньні для дакладчыкаў. Пач. а 6 гадз. веч.

## ЗАЎТРА

**Дом Камасьветы.** А 7 гадз. веч. адбудзецца даклад для партыйнага і камсамольскага актыву т. Рыўліна аб міжнародным становішчы. Пасьля—мастацкая частка. Білеты—па РК КП(б)Б, партклектывах і ў чытальні дому.

**Кастрыч. РК МОПРУ.** А 7 гадз. веч. адбудзецца нарада арцельных яч. Кастрычн. РК МОПР'у. Прысутнасьць членаў бюро абавязкова. Запрашаецца яч. актыў.

**Пушкінская біб-ка.** З прычыны перавучоту навук. адд. Пушкінскай біб-кі з 1-VII будзе закрыты на 1 мес. Просьба да чытачоў здаць кнігі, што знаходзяцца на руках, да 1-га ліпеня.

## ПАСЬЛЯЗАЎТРА

**Бел. МБІТ.** З прычыны намячаемай арганізацыі ў бліжэйшы час кансультацыі завочнікам тэхнічнага курсаў, бюро садзейства завочнаму тэхнічнаму навучаньню пры Бел. МБІТ праводзіць вучот слухачоў. Рэгістрацыя будзе працягвацца да 5-га ліпеня ў Доме Працы, другі паверх, пак. № 2, кожны дзень з 12-4 г. дня і 20, 25 і 30 чэрв. з 6-8 г. веч.

**Мен. АК КП(б)Б.** Аддзел агітацыі і масав. прапаганды склікае на 24-VI а 7 гадз. веч. нараду бытавых камісій ад наступных арганізацый: ЦРК, паляводсаюзу, акркалгассаюзу, малоч. саюзу, белжылсаюзу, акрана, белсельсаюзу, ЦСПСВ, т-ва П. Д. і прадстаўнікоў ад камсамольскіх і піянэрскіх арганізацый па пытаньні сьвяткаваньня X-цігодзьдзя вызваленьня БССР ад беларалякаў. Яўка абавязкова.

**Ад Кастрычн. РК КП(б)Б**

Дакладчыкамі па пытаньні рабочага забесьпячэньня на Кастрычн. раёне выдучаюцца наступныя т. т., якія прымаюўваюцца да наступных выторчых парткалек. і ячэек: Сьмірноў, Флеер, Бяруп, Гутман (Калгасцэнтр)—да партклек. в-ду «Бальшавік»; Міхоў Агранаўскі, Красоўскі і Новікаў (Калгасцэнтр) — да парткалект. чы Вішнеўскі, Пыжыкаў (Белпалядасюз) — да абутковай фабрыкі; Лібман, Казьлочыц (Малочсаюз), Гу віч (ЦКК РСІ) — да парткалектыву заводу «Энэргія»; Плаўнік, Руна (э-д «Бальшавік») — да шчотнай фабрыкі; Хэйлін — да яч. бойні; Хакін — да заводу «Чырвоная Ра Гінабург (БКС) — да яч. грузчыкаў; Брыскін (БСПС — да сьпіртгазаводу; Бартковіч (БСПС) — да хэмфармаду; Бацьвінік (БСПС), Стан (НКЮ) — да гуты; Міхайлаў (НКЮ) да каўбаснай фабрыкі; Мар (НКЮ) — да лямпавай фабрыкі; Колькі (НКЮ) — да мчаціпнай рыкі; Февралёў (НКЮ) — да 2-й Дзяржгандальбелу; Юрашкевіч (Н да фабрыкі «Адраджэньне»; Р (ЦК КП(б)Б) — да з-ду «Чырв. Х Кац (МЦРК) — да абутк. майс Альпяровіч (МЦРК) — да малоч воду; Зялючонак (МЦРК) — да п мер і вагі, Крэйдзель (МЦРК) — БСІКА; Капаплін (БДУ) — да імя Крупскай; Раготнэр (БДУ) аб'яднан. прафтэхшколы.

Кансультацыя для вылучан кладчыкаў адбудзецца ў Доме асьветы 22 чэрвеня роўна а 7 веч. (пакой № 19).

Яўка гэтых т. т. на кансульт абавязкова. Савецкія і напучальныя ячэйкі вылучаюць дакладчыкаў стойна, якія павінны зьявіцца на сультацыю ў абавязковым парадку.

# Папраўкі

У № 136 «Зьвязды» ў сьпісе ЦКК КП(б)Б пранушчаны прозьвішчы т. т.: Плятнёва, Рывінскага і Сухі якія выбраны зьездам у члены ЦК.

У гэтым-жа нумары газэты надрукавана, што т. Блаўштэйн выбран прэзыдыуму ЦКК, а кандыдатам у члены прэзыдыуму—т. Гараўскі. Між як пленум ЦКК КП(б)Б у члены прэзыдыуму ЦКК выбраў т. Гараўскі кандыдатам у члены прэзыдыуму выбран т. Блаўштэйн.

На тэхнічным недагляде пры друку артыкулу «Рэарганізацыя вышэйшай эканамічнай асьветы ў БДУ», зьмешчанага ў нумары 142 газэты «Зьвязды» пад подпіс аўтара **А. Гурло.**

У артыкуле—падрыхтуем масы — чын да ўборачнай кампаніі—(Зьвязда № 142) пранушчаны подпіс т. Лабада.

**Адказны рэдактар Ян. АСЬМ**


ВОЗОБНОВИТЕ ПОДПИСКУ НА 2-е ПОЛУГОДИЕ НА ИЗДАНИЯ ИЗДАТЕЛЬСТВА „РАБОТНИК ПРОСВЕЩЕНИЯ“

РАБОТНИКАМ КУЛЬТУРНОГО ФРОНТА ГАЗЕТА, ЖУРНАЛЫ, ПОДПИСНЫЕ ИЗДАНИЯ

| ПЕРИОДИЧ. ИЗДАНИЯ | ГОД | 7 мес. с 1/VI | 6 мес. | 3 мес. |
|---|---|---|---|---|
| За коммун. просвещение. Выходит 3 раза в неделю (без прилож.). | — | 2.50 | 2.25 | 1.25 |
| За коммун. просвещение с 1-м прил. | — | 4.— | 3.50 | 2.— |
| За коммун. просвещение с 2-мя прил. | — | 5.— | 4.50 | 2.50 |
| За коммун. просвещение с 3-мя прил. | — | 6.30 | 5.50 | 3.— |
| Работник Просвещения. Двухнедельн. журнал. | 5.— | — | 3.— | 1.75 |
| Листок технического работника. Ежемесячный журнал. | 1.— | — | —.60 | —.30 |
| Народный учитель. Ежем. журнал. | 5.— | — | 3.— | 1.75 |
| Научный работник. Ежемесячный журнал (без № 1). | 7.50 | — | 4.50 | 2.50 |
| Просвещение национальностей. Ежемесячный журнал. | 8.— | — | 4.50 | 2.50 |
| На путях к новой школе. Ежемесячный журнал (без №№ 1 и 2). | 5.50 | — | 3.50 | 2.— |
| За коммунистическое воспитание. Двухдекадный журнал. | 8.— | — | 4.50 | — |

| ПЕРИОДИЧ. ИЗДАНИЯ | ГОД | 6 мес. | 3 мес. |
|---|---|---|---|
| Новая педагогическая библиотека. 12 книг в год. | 10.— | 6.— | — |
| Культпоход. Двухнед. журнал для участников культпохода. | 4.— | 2.25 | 1.25 |
| Культпоход. Двухнед. журнал-вкладка для начинающих читать. | 1.75 | 1.— | —.60 |
| За массовое опытничество. Двухнед. журнал. | 2.60 | 1.40 | —.80 |
| О наших детях. Ежемес. журнал. | 1.80 | —.90 | —.45 |
| Русский язык в советской школе. 6 книг в год (без 1-й кн.). | 8.— | 5.50 | — |
| Обществоведение в трудовой школе. 8 книг в год. | 7.— | 4.— | — |
| Естествознание в трудовой школе. 8 книг в год (без 1-й и 2-й кн.). | 5.20 | 4.— | — |
| Физика, химия, математика, техника в трудовой школе. 8 книг в год (без 1-й и 2-й кн.). | 5.20 | 4.— | — |

| ПЕРИОДИЧ. ИЗДАНИЯ | ГОД | 6 мес. | 3 мес. |
|---|---|---|---|
| Книга на культурном фронте. Ежемес. бюллетень. (Вых. с 1/IV). | 1.50 | 1.— | — |
| Математическое образование. 8 номеров в год. | 6.— | 3.50 | — |
| Просвещение. Ежемесячный журнал ЛООНО. | 6.— | 3.— | 1.50 |
| Бюллетень ЛООНО. Еженедельный орган ЛООНО. | 10.— | 5.— | 3.— |
| Красноуголец. Журнал ЛООНО. Выходит 3 раза в месяц. | 3.— | 1.75 | —.90 |
| Просвещение на Урале. Ежемесячный журнал Уралоно. | 4.50 | 2.25 | 1.15 |
| Распоряжения по народному образованию. Двухнедельник Уралоно. | 2.50 | 1.25 | —.70 |
| Культурный фронт ЦЧО. Ежемесячный журнал облоно ЦЧО. | 6.— | 3.— | — |

| ПОДПИСНЫЕ ИЗДАНИЯ | Подписная цена | Можно внести задато |
|---|---|---|
| Народное просвещение за рубежом. 3 тома. | 18.— | 5.— |
| В помощь агрономизации школы. 6 кн. | 5.— | 2.— |
| Заочн. курсы по диалект. материализму для научных работников и культкадров. | 10.— | 5 |
| **Можно подпис. отдельно:** | | |
| Общий курс. | 4.— | — |
| Курс для физиков, математиков и химиков. | 2.— | — |
| Курс для биологов, врачей и психологов. | 2.— | — |
| Курс для обществовед., педагогов и экономистов. | 3.— | — |

„ЗА КОММУНИСТИЧЕСКОЕ ПРОСВЕЩЕНИЕ“ даст приложения: 1. МЕТОДИЧЕСКИЙ ПУТЕВОДИТЕЛЬ ДЛЯ СЕЛЬСКОЙ ШКОЛЫ. 2. МЕТОДИЧ. ПУТЕВОДИТЕЛЬ ДЛЯ ФАБ.-ЗАВ. и ГОРОДСК. ШК. 3. СПУТНИК ПРОСВЕЩЕНЦА-ОБЩЕСТВЕННИКА (Политпросветработник).

ПОДПИСНУЮ ПЛАТУ на журналы, выходящие в Ленинграде, Свердловске и Воронеже, следует направлять в соответствующие отделения изд-ва „РАБОТНИК ПРОСВЕЩЕНИЯ“.

ПРОСПЕКТ БЕСПЛАТНО

ПОДПИСКА ПРИНИМАЕТСЯ: МОСКВА, улица Герцена, 10, в ОППИ изд-ва, в отделениях и магазинах изд-ва и у письмоносцев.

ПЕРЕВОДЫ НАПРАВЛЯТЬ: Москва, 19, Воздвиженка, 10. ИЗД-ВО „РАБОТНИК ПРОСВЕЩЕНИЯ“.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР | Гастролі 1-га Маскоўскага перасоўнага тэатра ОПЭРЫ І БАЛЕТУ
Сёньня, 22 чэрвеня „ДЕМОН“
Білеты ў касе тэатру і раб. касе.
ПАЧАТАК А 9 ГАДЗ. 30 м.

Кіно-тэатр „Культура“ — Вясёлая камэдыя ў 6 частках „Жыцьцё зусім на ўвесь ход“ ЗВЫШ ПРАГРАМЫ кіно-палітасьвет фільм ў 2 ч. МАЛАНКА. Пач. 1-га сэансу роўна а 8 г., 2-га—10 г. Каса—ад 6 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал — Нямецкі фільм вытворчасьці „Уфа-фільм“ „ДЗЕЛАВЫ ЧАЛАВЕК“ У галоўных ролях: Рытэ Робэрто, Фрыц Кампэрс, Віллі форст. Пачатак 1-га сэансу а 7-й гадз. Каса ад 5 г.

КІНО САД (Савецкая, 71) — ПАДВОЙНАЯ ВЫДАТНАЯ ПРАГРАМА 2 фільмы ў адзін сэанс ВАРОТЫ КАУКАЗУ ў 6 част. ГАРОЛЬД ЛОЙД у лепшай камэд. Дзеля прыгожых вачэй ў 3 част. ПАЧАТАК 1-га СЭАНСУ а 9 ГАДЗ. Каса адчынена ад 6 гадз. увеч.

КІНО Пралетары — Замежны мастацкі фільм „ДРУГІ ШЛЮБ“ кіно-драма ў 8 частках. Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса адкрыта з 5 гадз.

І-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр“ — Падвойная праграма. 2 фільмы ў адзін сэанс. ГІГАНТ 5 частках. СЕНЬКА АФРЫКАНЕЦ ў 2 частках. Пачатак 1-га сэансу а 2 гадзіне. Каса адчынена з 12 гадз. дня.

Кіно „СПАРТАК“.
Звыш праграмы гастролі артыстых сатыры ТВОРЦАВА І ВЛАДАВА.
НА ЭКРАНЕ ПАТ і ПАТАШОН у карціне
ВЫДАТНЫЯ ПАДАРОЖНІКІ
камэдыя ў 7 частках.
УВАГА: Сёньня 4 сэансы.
ПАЧАТАК 1 с.—7 г., 2 с.—8 г. 30 м., 3 с.—10 г., 4 с.—11 г. 30 м.
КАСА—ад 6 гадз.

ЗАОЧНЫЕ ГОСКУРСЫ РОСПИСИ (РАЗРИСОВКИ). Роспись по всевозможным тканям: мягким золот., серебр., маслян., рельефн. и по рисункам кроснами. Бисерн., жемчужн. и мерцающ. первоклассная Роспись по сосудам, стеклу, целлулоиду, кожи и дереву. Полный курс, 12 уроков в 4 мес. К урокам дается свыше 100 рис. (кроме текстовых). По оконч. выд. свидет. Умение рис. не требуется. Проспект и программы высыл. за 20 коп. мел. мар.
ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ СОНО.
МОСКВА, ул. Дзержинского, д. 1.

ПАДПІСКУ НА 2-ОЕ ПАЎГОДЗЬДЗЕ 1930 Г. ЗДАВАЙЦЕ НА ВСЕ ГАДЫ І ПОШЦЕ

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА КАМІТЭТУ ГАРАДЗЬКОГА УЗЕМАДАВАЛЬНІЦТВА
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Савэтаў, тэл. 12
АДКРЫТА ад 9 гадз. рэн. да 9 г. веч.
Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях: на ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўнікіх, нервовых.
Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрытыя 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
Рэнтген (здымкі, праасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 1 г 30 м. да 9 г. увеч.
Прыём хіміка-бактэрыялёгічных аналізаў. Аптэка.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. веч. штодзённа
Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на даму па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.
Дэнжуроты дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.
Ночное дэжурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз. раніцы.
Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту. Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную дыфэрэнцыяваную плату.

СЕКАРОВСКАЯ ЖИДКОСТЬ
МОСКВА 55, 2 ВЫШЕСЛАВЦЕВ ПЕР. 6

ДА УБОРАЧНАЙ І АСЕНЬНЯЙ ЗАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ!
ДРУКУЮЦЦА І ХУТКА ВЫЙДУЦЬ З ДРУКУ:
1) Уборачная і асеньняя засеўная кампанія 1930 г. (зборнік пастаноў і матар'ялаў).
2) ПАДЫСЕЎ. Організацыя працы ў калгасах у час уборкі ўраджаю.
3) КУДЗІНАЎ. Калгасы асеньняя засеўная кампанія.
4) ГУТЦАЙТ. Як калгасу скласьці плян уборачнай і асеньняй засеўнай кампаніі.
5) З А Я Ц. Уборачная і асеньняя с. г. кампанія.
6) КІПРЫЯНЕЦ. Асеньні выраб глебы пад ярыну.
Белдзяржвыдавецтва.

Для здачы АБВЕСТКІ у газэту „ЗЬВЯЗДА“ звяніце па тэл. 7-81

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ даставкі газэты „ЗЬВЯЗДА“ звяніце па тэл. 2-49

ШУКАЮ СВАЮ ДАЧКУ Ганну Федараўну Гаранец 20 год., якая пайшла невядома куды ў чэрвені месяцы 1929 г. Просьба да асоб, якія ведаюць месца прабываньня яе, паведаміць на адрасе: Асінбуд, Высоцкі о. е. в. Вялікае Бабіна. Міхасю Федараву Гараўцу.

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумэнту

Згубленыя і ўкрадзеныя наступныя дакументы лічыць несапраўднымі:

Пропуск Алувек С. П., выд. Мен. АДПУ. 610
Пазная кн. Каратчэнка А., выд. Сіроцінск. спаж. т-вам. 611
Вуч.-конск. кн. Астапенка С. П., выд. Чавуск. РВК. 612
Вайск. біл. Саленіка А. Я., выд. Койданаўск. РВК. 613
Вуч.-конск. кн. Казуціна Н. Я., выд. Чавуск. РВК. 614
Асабов. кн. № 45 Аніковіча А. І., выд. Талочынск. РВК. 615
Вуч.-конск. кн. Юрчэнкавай Ф. П., выд. Чавуск. РВК. 616
Пазная кн. № 1179 Бурай М., выд. Бярэзінск. спаж. т-вам. 617
Вуч.-конск. кн. Таболіна Я. М., выд. Сьмілавіцк. РВК. 618
Вайск. кн. Савіча І. Ю., выд. б. Цытвянск. ВВК. 619
Вуч. - конск. кн. Кулейца А. П., выд. Нараўлянск. РВК. 620
Канд. карт. № 227678 Гамеза Ф. Ф., выд. Мен. АК КП(б)Б. 621
Пазная кн. № 258 Кудзіна Р. Г., выд. Камена-Борск. спаж. клап 622
Вуч.-конск. кн. № 11687 Анісімава Е. Т., выд. Чавуск. РВК. 623
Пазная кн. № 442 Сімашавай А., выд. Сіроцінск. спаж. т-вам 624
Вуч.-конск. кн. Галічэнка І. В., выд. Чавуск. РВК. 625
Вуч.-конск. кн. і асабов. кн., выд. Чавуск. РВК на імя Дзьмітрыева А. А. 626-627
Вайск. біл. Арцюковіча Ю., выд. Мазырск. АВК. 628
Пасьведч. Чыжоваў К., выд. ЦК УсеКП(б). 629
Вуч.-конск. кн. № 17 Гарэліка Е. выд. Чавуск. РВК.
Вуч.-конск. кн. № 874 Ганчар Ц. Г., выд. Нараўлянск. РВК.
Вайск. кн. Хадакоўскага Д. М., выд. Дзярнавіцк. васпкаматам.
Вуч.-конк. карт. № 2217 Шыдлоўск Д., выд. Сьмілавіцк. РВК.
Мэтр. даведка № 705 Хазяніка Л. выд. Сьмілавіцк. міліцыяй.
Кап. кн. Міза Д. Ф., выд. Пухав спаж. т-вам.
Партызанск. пасьведч. Астрэка С. выд. Скрыгалаўск. с.-с.
Вайск. кн. Літаровіча М.
Мэтр. даведка Бігуса М. К., выд. Сьмілавіцк. ЗАГС'ам 28-VIII-29 г. за № 
Пазная кн. № 569 Макатой М., выд. Нараўлянск. спаж. т-вам.
Асабов. кн. Каваленка О. М., выд. Пелькс. РВК за № 7
Вуч.-конск. кн. № 244 Сьвістуна П. М., выд. Чавуск. РВК.
Вуч.-конск. кн. Васіленка А. А.
Пазная кн. № 827 Батура О., выд. Гомльск. спаж. т-вам.
Пазная кн. № 232 Капінскага В., выд. Бягомльск. спаж. т-вам.
Пазная кн. Вераскоўскага П. Т., выд. Пухавіцк. спаж. т-вам.
Вайск. кн. № 3186, выд. 4 стр. п., выд. сам. біл. № 36725, выд. Бярэзінск. ЛКСМБ на імя Собаля К. С.
Даверанасьць, выд. Белсельтрэстам № 70, чл. біл. саюзу СГЛР за № 13 на імя Новіка М. М.


Менск, Галоўлітбел № 337. Друкарня газэты «Зьвязда», Менск